

КАМУ МІГЦЯЦЬ АГНІ ПРЫТОНАЎ? 6

НЕЗВАРОТНАЯ ХВАРОБА СТАРАСЦІ 11





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЖНІЎНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 151 (29018)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КУХАРАЎ, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Сёлета тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі павышацца не будуць. Як вядома, у адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта тарыфы на паслугі ЖКГ не павінны павышацца больш чым на пяць долараў у год. Сёлета ў якасці эксперымента кошт паслуг павышаўся ў два этапы: з 1 студзеня і з 1 чэрвеня. З 1 студзеня падаражэлі паслугі газа-, электра- і водазабеспячэння, водаадвядзення, па капрамонце, санітарным утрыманні дапаможных памяшканняў, памеры кампенсацыі выдаткаў на электраэнергію, а з 1 чэрвеня — гарачае водазабеспячэнне і ацяпленне, за якое насельніцтва будзе плаціць па факце толькі ў лістападзе, пасля пачатку ацяпляльнага сезона. Гэта быў удалы эксперымент. Сур'ёзных прэтэнзій з боку насельніцтва не было».*

# ПАЛЯВЫЯ РАБОТЫ ЦЁТКІ АЛЕНЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Былая саўгасная даярка, умелая рукадзельніца з вёскі Хралы Глыбоцкага раёна Алена МУРАВЕЙ, маючы шмат вольнага часу, дапамагае па падворку аграсядзібы сваёй аднавяскоўцы і суседцы — даглядае статак козачак. Кожны летні дзень выводзіць іх за ваколіцу на духмяныя травы. У полі Алена Пятроўна таксама не губляе часу — займаецца вязаннем і шыццём. Цяпер яна вяжа панчошкі для сваіх унукаў.**

## КОРАТКА

• **Дзень ведаў у Беларусі пройдзе 2 верасня.**

• У Лідзе ўсталёўваюць помнік князю Гедыміну.



• **Каля 50 тысяч лазерных умяшанняў на вачах праводзяць штогод у Беларусі.**

• У нашай краіне з'явіліся электронныя сім-карты. Дзякуючы eSIM у адным тэлефоне цяпер можа быць да пяці абаненцкіх профіляў (г. зн. розных нумароў).

• **«Белдзяржпрам» шукае інвестара для прадпрыемства «Дываны Брэста».**

• Свята да юбілею каранацыі абраза Божай Маці «Уладарка азёраў» правядуць 16—17 жніўня ў Браславе.

Бяспека

# СТАРЫ АТРАКЦЫЁН АДПАЧЫНАК НЕ САПСУЕ

## Калі ён, вядома, тэхнічна спраўны

**Паркі ў буйных гарадах і нават у некаторых дробных раённых цэнтрах немагчыма ўявіць без велізарных механізаваных атракцыёнаў. Але там, дзе весялосць, адначасова прысутнічае і рызыка. Па звестках Дзяржпрамнагляду, каля 2/3 такіх агрэгатаў ужо адпрацавалі нарматыўны тэрмін службы, устаноўлены заводам-вытворцам. Пры гэтым, праўда, за апошнія восем гадоў у нашай краіне з'явілася 109 новых машын, якія падлягаюць рэгістрацыі ў ведамстве.**

— Але тут няма ніякага страху, — запэўнівае **начальнік упраўлення нагляду за бяспекай пад'ёмных збудаванняў і атракцыёнаў Дэпартамента па наглядзе за бяспечным вядзеннем работ у прамысловасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Пётр КЛІМКО.** — Ёсць шэраг мерапрыемстваў, скіраваных на бяспечную работу такіх «ветэранаў». Штогод праводзіцца тэхнічнае дыягнаставанне. Гэта паглыбленае даследаванне ўсіх крытычных канструктыўных кампанентаў, ад якіх залежыць бяспека як наведвальнікаў, так і абслугоўвага персаналу. Калі ўсе дэфекты і няспраўнасці ліквідуюць, будзе праведзена другая абавязковая працэдура — тэхнічны агляд, які ўключае ў сябе ў тым ліку і выпрабаванне пад нагрузкай. Толькі пасля таго, як атракцыён вытрымае ўсе праверкі і будзе прызнаны працаздольным, эксперт Дзяржпрамнагляду дасць дабро на яго эксплуатацыю.

СТАР. 3

Сакрэты смаку

# DOLCE VITA ПА-БЕЛАРУСКУ

**Тэхнолаг-кандытар Вольга ПІСКУН — пра любімыя ласункі, новыя рэцэпты і тое, як захаваць фігуру, калі штодзень нос казыча водар шакаладу**



Фота Ганны КУРАК.

**Калі замежнікі запытваюцца, што трэба везці з Беларусі ў якасці сувеніра, многія мясцовыя раяць завітаць у кандытарскія аддзелы прадуктовых крам. Цукеркі, шакаладкі, зефір — той самы айчынны прадукт, за які сапраўды не сорамна. «Звязда» адправілася ў Нарочлю, каб пазнаёміцца з тымі, хто стаіць за стварэннем салодкага іміджу краіны.**

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

# ВЫЛЕЧЫЦЬ «ХВАРОБЫ» МЕДЫЦЫНСКАЙ СІСТЭМЫ

## Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра аховы здароўя

**З моманту назначэння Уладзіміра КАРАНІКА на пасаду міністра аховы здароўя прайшло крыху больш за два месяцы. Тады на «кадравай» сустрэчы Прэзідэнт даў даручэнні між іншым — выкараніць карупцыйны складнік у галіне, вырашыць праблемы з абсталяваннем і эфектыўней заняцца імпартазамяшчэннем фармпрэпаратаў. Пра тое, наколькі паспяхова ідзе работа па ўдасканаленні сістэмы, Уладзімір Каранік далажыў кіраўніку дзяржавы.**

Найбольш актуальнымі, па словах Прэзідэнта, для яго асабіста і грамадскасці з'яўляюцца пытанні закупак медыцынскага абсталявання і цэнаўтварэння. Прэзідэнт упэўнены, што медыкі набываюць прыборы вядучых фірмаў, таму якасць (у адрозненне ад цаны) не выклікае пытанняў. «І самае галоўнае — гэта ўстанаўленне той цаны, якая ёсць на сусветных рынках, і работа без пасрэднікаў. Натуральна, што пасрэднікі да 30 працэнтаў, а тое і больш, павялічваюць цэны на абсталяванне. Тое ж самае датычыцца і лекавых сродкаў, прэпаратаў, субстанцый і гэтак далей», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што Уладзімір Каранік добра ведае «хваробы» і болевыя пункты нашай сістэмы аховы здароўя, і для іх вырашэння трэба зрабіць сур'ёзныя намаганні. «Цягнуць нельга», — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што на закупку замежных лекаў трацілі паўмільярда долараў. «Недапушчальна шмат. Тым больш мы можам ствараць свае лекі», — сказаў кіраўнік краіны.

Задача для спецыялістаў — рэалізаваць імпартазамяшчэнне да 50 працэнтаў лекавых сродкаў — выканана. А сёння, на думку Аляксандра Лукашэнкі, увагу трэба звярнуць на субстанцыі.

Яшчэ адно пытанне, якое закранулі на сустрэчы, — удасканаленне медыцынскай сістэмы. За часы існавання яна зарэкамендавала сябе, але трэба ўносіць і карэктывы.

* * *

Пасля размовы з Аляксандрам Лукашэнка міністр аховы здароўя паведаміў журналістам аб асноўных навачаўядзеннях і планах па ўдасканаленні галіны.

Паглыблены маркетынг, выключэнне неабгрунтаванага пасрэдніцтва, работа з вытворцамі — такімі метадамі спецыялісты вырашаюць праблему высокіх цэн пры закупцы абсталявання і запасных частак.

«Па некаторых пазіцыях па дарагім абсталяванні цана знізілася ад 26 да 54 працэнтаў. Па некаторых запасных частках зніжэнне цаны яшчэ больш адчувальнае», — расказаў міністр аховы здароўя.

Скарачаецца амаль у два разы і час на рамонт абсталявання. Доўгія тэрміны наладкі выклікалі нараканні грамадзян і звышнарматыўную нагрузку на працуючыя прыборы. «Цяпер па меры аднаўлення таго абсталявання, якое выходзіла са строю, пачынаюцца праблемы ў таго абсталявання, якое працавала вышэй сваіх магчымасцяў, — паведаміў Уладзімір Каранік. — Работа актывізавалася, і апошнія тры тыдні мы ацэньваем станоўча, што ўпершыню мы рамантуем і ўводзім у эксплуатацыю абсталявання больш, чым яно выходзіць са строю. І мы плануем, магчыма, за жнівень — пачатак верасня пытанні аднаўлення працаздольнасці ўсяго абсталявання, якое маем, вырашыць. І тыя апараты, што эксплуатуюцца больш за дзесяць гадоў, і рамонт якіх эканамічна немэтазгодны, будуць заменены на новыя».

Сёння пяць камп'ютарных тамографаў ужо знаходзяцца ў працэдуры пастаўкі.

Па праекце новага закона рэгістрацыя некаторых замежных прэпаратаў будзе займаць 35 дзён і каштаваць 120 базавых велічынь. Гэта зробіць больш просты схему рэгістрацыі лекаў, якія не выпускаюцца ў нашай краіне і маюць міжнародныя сертыфікаты якасці. Па словах міністра, навацыя забяспечыць здаровую канкурэнцыю на рынку і будзе стымуляваць развіццё айчыннай фармгаліны.

«Многія дастаткова буйныя кампаніі будуць разумець, што мэтазгодна не займацца пастаўкамі прэпаратаў ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі, а асвоіць вытворчасць тут і ажыццявіць трансфер тэхналогій, каб мець перавагу за кошт меншых выдаткаў», — растлумачыў Уладзімір Каранік.

Абмяркоўваецца пытанне стварэння Дзяржфармнагляда. Структура будзе сачыць за якасцю замежных і айчынных прэпаратаў, якія выпускаюцца на рынку. «Гэта ў рамках ужо існуючай структуры за кошт пераразмеркавання паўнамоцтваў», — канстатаваў кіраўнік ведамства.

Стануць больш жорсткімі патрабаванні да складоў і ўмоў захавання лекаў.

У краіне з'явілася магчымасць стварэння міжраённых і міжрэгіянальных цэнтраў спецыялізаванай дапамогі. Такія бальніцы будуць валодаць магнітна-рэзанансными і камп'ютарнымі тамографамі, ангіяграфіяй, каб жыхары рэгіёнаў атрымлівалі дапамогу згодна стандартам якасці, даступным пакуль толькі ў абласных і рэспубліканскіх цэнтрах.

Удзеляць увагу кадраваму забеспячэнню раённых бальніц, выбудоўванню лагістыкі дастаўкі пацыентаў у лячэбныя цэнтры. Ужо павялічаны нарматыў забяспечанасці брыгадамі хуткай дапамогі насельніцтву, якое пражывае ў раёнах, аддаленых ад цэнтраў.

«Я думаю, гэта работа будзе працягнута для таго, каб мы стварылі лагістыку, што дзе б ні знаходзіўся наш пацыент, у выпадку якой-небудзь сур'ёзнай, пагражаючай жыццю сітуацыі было захавана правіла «залатой гадзіны» (на працягу гадзіны ён можа быць дастаўлены ў клініку, якая валодае ўсімі магчымасцямі для аказання дапамогі на сучасным узроўні)», — акцэнтаваў увагу міністр.

Кантраляваць працэсы закупак дапамогуць інфармацыйныя тэхналогіі. Па словах міністра, цэнтралізацыя закупак актуальная не заўсёды. Напрыклад, некаторыя пазіцыі для штодзённай работы клінік трэба аддаць для самастойнага набыцця медыцынскім установам.

«Мы зараз сумесна з Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю, рэзідэнтамі Парка высокіх тэхналогій абмяркоўваем стварэнне платформы, якая будзе аналізаваць гэтыя вялікія аб'ёмы даных у аўтаматычным рэжыме і выяўляць тыя аднатыпныя пазіцыі, якія рознымі бальніцамі закупляюцца па рознай цане», — ананcаваў навачаўядзенне Уладзімір Каранік.

Падрыхтаваны змяненні і ў рэгістрацыю вырабаў медпрызначэння.

Карыстальнікі сацсеткі дапамаглі медыкам у падрыхтоўцы дапаўненняў у нарматыўную базу рэгістрацыі гранічных цэн на лекі. З дапамогай інтэрнэт-карыстальнікаў прааналізаваны прэпараты, якія найбольш часта сустракаюцца, і зараз ведамствам рыхтуюцца адпаведныя дапаўненні ў дакумент. Інфармацыю перададуць у МАРГ, якое вывучыць сітуацыю на суседніх рынках і зарэгіструе гранічную цану.

Па словах Уладзіміра Караніка, гэта не прывядзе да скарачэння паставак лекаў — «Белфармацыя» пачынае без пасрэднікаў заключаць кантракты з вытворцамі. «Калі гэтыя прэпараты знікнуць у камерцыйных аптэках, яны з'явяцца па адпаведнай цане ў дзяржаўных», — адзначыў міністр.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# У НЯПРОСТЫХ УМОВАХ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 12 жніўня заслухаў даклад міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Анатоля Хацько аб ходзе ўборкі ўраджаю, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Як было адзначана, працаваць аграрыям даводзіцца ў складаных умовах надвор'я, што, вядома, значна тармозіць працэс уборкі збожжавых культур. Тым не менш у цэлым па краіне цяпер на палях застаецца каля 20 працэнтаў ураджаю, намалочана больш за 5,5 мільёна тон збожжа.

Па стане на 12 жніўня збожжавыя і зернебабовыя культуры (без кукурузы, грэчкі і проса) убраны больш чым з 1,7 мільёна гектараў, што складае 79,8 працэнта ад запланаванага. Сярэдняя ўраджайнасць — 32 ц/га (у 2018 годзе — 27 ц/га). План паставак збожжа ў лік дзяржзаказу складае 815 тысяч тон. На 12 жніўня заданне выканана на 76,1 працэнта (620 тысяч тон).

Адносна карціны па рэгіёнах Прэзідэнту было далажана, што асабліва цяжкая сітуацыя на сённяшні дзень у Магілёўскай, на поўначы Мінскай і ў Віцебскай абласцях. І ў цэлым па краіне ўмовы жніва застаюцца вельмі няпростымі.

Улічваючы абставіны, Прэзідэнт трымае ход уборкі ўраджаю на пастаянным асабістым кантролі, а профільнаму міністру было даручана мабілізаваць усе сілы і зрабіць усё магчымае для таго, каб з плошчаў, што засталіся, ураджай быў убраны з мінімальнымі стратамі.




# ІНФЛЯЦЫЯ Ў ЛІПЕНІ СКЛАЛА 0,2 %

**Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў ліпені 2019 года ў параўнанні з чэрвенем 2019-га склаў 100,2 %, са снежнем 2018 года — 103,1 %, паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт.**

Базавы індэкс спажывецкіх цэн, што выключаў змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, якія падпадаюць пад уплыў фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару, у ліпені ў параўнанні з чэрвенем 2019-га склаў 100,2 %, са снежнем 2018-га — 102,3 %.

Харчовыя тавары ў ліпені падаражэлі на 0,1 % у параўнанні з чэрвенем 2019-га і на 2,9 % у параўнанні са снежнем 2018-га. Цэны на нехарчовыя тавары знізіліся на 0,1 % у параўнанні з чэрвенем 2019-га і выраслі на 2,2 % у параўнанні са снежнем 2018-га. Паслугі ў ліпені ў параўнанні з чэрвенем гэтага года падаражэлі на 0,7 %, у параўнанні са снежнем 2018-га — на 4,8 %.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Лізавета II лічыць, што брытанскія палітыкі не здольныя кіраваць краінай



Каралева Вялікабрытаніі Лізавета II расчараваная сітуацыяй, якая склалася ў краіне ў сувязі з Brexit, яна не верыць у здольнасць цяперашняга пакалення палітыкаў эфектыўна кіраваць дзяржавай. Пра гэта паведаміла газета The Sunday Times, спасылаючыся на крыніцу ў палацы, якая валодае «бездакорнай рэпутацыяй». «Мне здаецца, што яна адчувае непадробны непакой», — заявіў суразмоўнік выдання, па словах якога адпаведную фразу каралева агучыла на закрытым мерапрыемстве яшчэ летам 2016 года — неўзабаве пасля таго, як прэм'ер-міністр Дэвід Кэмеран падаў у адстаўку на фоне няўдалых для яго вынікаў рэферэндуму аб Brexit. «Яна выказала сваю незадаволенасць і расчараванне якасцю палітычнага кіраўніцтва, і за мінулы час гэта расчараванне толькі ўзмацнілася», — дадала крыніца Times. Пры гэтым на фоне надыходзячай даты выхаду Злучанага Каралеўства са складу Еўрасаюза ў брытанскіх СМІ з'яўляецца ўсё больш паведамленняў аб тым, што як урад прэм'ер-міністра Барыса Джонсана, так і апазіцыя на чале з лідарам Лейбарысцкай партыі Джэрэмі Корбінам плануюць дасягнуць сваіх палітычных мэт, звярнуўшыся наўпрост да каралевы з просьбай скарыстацца наяўнымі ў яе паўнамоцтвамі.

## Аляхандра Джаматэі перамог на прэзідэнцкіх выбарах у Гватэмале

Кандыдат ад правацэнтрысцкай партыі «Наперад» Аляхандра Джаматэі стаў пераможцам другога тура прэзідэнцкіх выбараў у Гватэмале. Вынікі галасавання апублікаваў Вышэйшы выбарчы трыбунал цэнтральнаамерыканскай рэспублікі. Згодна з яго падлікамі, палітык атрымаў 58,4 працэнта галасоў пасля апрацоўкі бюлетэняў з 98 працэнтаў участкаў. Ягоная сапернiца Сандра Торэс ад сацыял-дэмакратычнай партыі «Нацыянальны саюз надзеі» заручылася падтрымкай прыкладна 41 працэнта тых, хто прагаласаваў, і прызнала сваё паражэнне. У спісы выбаршчыкаў было ўнесена крыху больш за 8 мільёнаў чалавек. Джаматэі, урач па адукацыі і бацька траіх дзяцей, чацвёрты раз прэтэндаваў на вышэйшую дзяржаўную пасаду. Упершыню ён выставіў сваю кандыдатуру ў 2007 годзе, фінішаваўшы трэцім. У 2011-м і 2015-м ён таксама быў удзельнікам прэзідэнцкай гонкі, аднак у абодвух выпадках паказаў вельмі нізкія вынікі. У 2017 годзе палітык заснаваў уласную партыю «Наперад», якая на парламенцкіх выбарах сёлета ў чэрвені заняла другое месца. Сярод асноўных абяцанняў перадвыбарчай кампаніі палітыка значыліся развіццё эканомікі, павелічэнне прытоку замежных інвестыцый і стварэнне новых рабочых месцаў, каб гватэмальцы радзей пакідалі краіну ў пошуках лепшай долі. Ён таксама заяўляў, што выступае супраць абортаў і аднаполых шлюбаў.

## Да Зямлі ляціць астэроід памерам з піраміду Хеопса

Астэроід, які пераўзыходзіць па памеры Вялікую піраміду Гізы, таксама вядомую як піраміду Хеопса, набліжаецца да Зямлі. Пра гэта паведаміла NASA. Паводле наяўных даных, яго дыяметр складае 160 метраў, што на 20 метраў больш за егіпецкую піраміду. Адзначаецца, што ён наблізіцца да нашай планеты ў канцы гэтага месяца. Так, 28 жніўня астэроід будзе ў 40 разоў бліжэй да Зямлі, чым Венера. Аднак гэтае нябеснае цела нам не пагражае. Пра гэта паведаміла RT са спасылкай на загадчыка аддзела фізікі і эвалюцыі зорак Інстытута астраноміі РАН Дзмітрыя Вібе. Паводле яго слоў, астэроід ніяк не паўплывае на Зямлю, паколькі праляціць на адлегласці мільён кіламетраў ад яе. Такім чынам, ён ніяк не можа мець уздзеянне на нашу планету, растлумачыў вучоны. «Гэта каласальная адлегласць па зямных мерках», — адзначыў Вібе.

# Галоўная задача — бяспека і камфорт

Пашпарты гатоўнасці ўстаноў адукацыі, інтэрнатаў неабходна падпісаць да 23 жніўня

**Стварэнне бяспечных, камфортных і здароўезберагальных умоў ва ўсіх установах адукацыі, інтэрнатах — асноўная задача. Яна павінна быць цалкам вырашана перад пачаткам адукацыйнага працэсу і засяленнем.**

«Усе рамонтныя работы, абнаўленне абсталявання і падпісанне пашпартоў гатоўнасці ўстаноў адукацыі, інтэрнатаў да новага навучальнага года неабходна завяршыць да 23 жніўня», — падкрэсліў **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** на ўчарашняй нарадзе ва ўрадзе. Ён нагадаў пра даручэнні кіраўніка дзяржавы аб удасканаленні арганізацыі харчавання. Асаблівую ўвагу з іх улікам трэба надаць стану харчаблокаў і сталовак — яны павінны адпавядаць устаноўленым санітарным нормам і правілам. Органам дзяржсаннагляду трэба будзе ўважліва пракантраляваць гэтыя пытанні пры прыёмцы аб'ектаў, адзначыў віцэ-прэм'ер.

У час нарады абмяркоўвалася, як ідуць мадэрнізацыя харчаблокаў і сталовак, замена абсталявання, падбор персаналу, як вырашаюцца іншыя праблемныя пытанні.

«Да пачатку навучальнага года павінны быць прыведзены ў парадак спартзалы, школьныя стадыёны, спартыўныя збудаванні», — Ігар Петрышэнка ўдакладніў, што яны заўсёды павінны быць у парадку, размова ідзе пра дааснашчэнне новым абсталяваннем. Адначасова віцэ-прэм'ер звярнуў увагу на неабходнасць аснашчэння школ спартыўным інвентаром і абсталяваннем, у тым ліку лыжным.

«У абласцях і Мінску іх забяспечанасць застаецца недастатковай», — канстатаваў намеснік прэм'ер-міністра. У сувязі з гэтым на нарадзе разглядаліся меры, якія прымаюць мясцовыя ўлады і Мінадукацыі для вырашэння задачы. Закраналася таксама пытанне вучэбнага кнігавыдання.

Да 1 верасня Мінадукацыі неабходна завяршыць пачатае яшчэ ў 2015 годзе паэтапнае абнаўленне школьных падручнікаў. Да 1 жніўня ўбачыла свет толькі палова з запланаваных навучальных дапаможнікаў для школ. Ігар Петрышэнка пацікавіўся, як арганізавана работа па выданні і своечасовай дастаўцы падручнікаў у школы.

Паводле аператыўнай інфармацыі, у новым навучальным годзе будзе працаваць 2951 установа дашкольнай адукацыі і 3003 — агульнай сярэдняй. Адчыняць дзверы для навучэнцаў 127 прафесійных каледжаў, ліцэяў і 111 ССНУ, а таксама 47 і 83 установы, якія рэалізуюць праграмы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі адпаведна. Студэнты будуць вучыцца ў 42 дзяржаўных і 9 прыватных ВНУ.

**Паводле БелТА.**

## ДАСТАВАЙЦЕ ПАРАСОНЫ

**Пробліск цяпла, якое завітала да нас у панядзелак, акажацца кароткім. Ужо сёння надвор'е істотна зменіцца. Пойдуць дажджы, якія зацягнуцца ледзь не да канца тыдня. Падрабязней пра сінаптычную абстаноўку расказалі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Аўторак выдасца багатым на непагадзь. Аб'яўлена штармавое папярэджанне. На большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Месцамі дажджы пяройдуць у моцныя лівні. На паўднёвым усходзе чакаецца нават град. Усё гэта нам забяспечаць актыўныя і кантрасныя франтальныя раздзелы, якія будуць перамяшчацца праз нашу тэрыторыю з боку паўднёва-заходняй Еўропы. Пры гэтым удзень будзе ад 19 да 25 цяпла, а па Гомельшчыне паветра прагрэецца да 26—32 са знакам «плюс».

У сераду надвор'е істотна не зменіцца. Па-ранейшаму будуць ісці дажджы, месцамі моцныя і з навальніцамі. На ўсходзе да таго ж узмоцніцца вецер з парывамі да 15—20 метраў за секунду. І пахаладае. Уначы будзе ўжо ад 10 да 17 градусаў, а ўдзень — ад 16 да 23. Цёплае надвор'е, адна, не пакіне да канца Гомельшчыну — там месцамі можа быць і 24—29 вышэй за нуль.

Дажджы на большай частцы тэрыторыі Беларусі захаваюцца і ў ноч на чацвер, а па Віцебшчыне яны чакаюцца даволі інтэнсіўныя. Удзень жа франтальныя раздзелы нарэшце сыдуць на ўсход. Неба расчысціцца ад аблокаў, але істотна паветра сонца не прагрэе. Калі ўначы чакаецца ад 8 да 15 градусаў цяпла, то ўдзень — ранейшыя 17—23.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Прыёмная кампанія — 2019

## СЯРОД ПЕРШАКУРСНІКАЎ БДУ — 85 СТАБАЛЬНІКАЎ

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце падвялі вынікі прыёмнай кампаніі 2019 года. Як паведамілі ў прэс-службе ўніверсітэта, на ўсе формы атрымання вышэйшай адукацыі першай ступені залічаны 5167 абітурыентаў.**

Сярод залічаных на дзённую бюджэтную форму навучання па выніках ЦТ 84 % абітурыентаў набралі 300 балаў і больш. Гэты паказчык стаў найлепшым за апошнія чатыры гады (у 2016 годзе — 63 %, 2017 годзе — 70,3 % і 2018 годзе — 72,7 %).

Усяго студэнтамі дзённай бюджэтнай формы навучання сталі 2130 чалавек. Конкурс па ўніверсітэце на бюджэт склаў 1,78 чалавека на месца.

Сярэдні бал залічаных па выніках ЦТ вырас да 329 балаў. Пры гэтым 72 % спецыяльнасцяў на дзённай форме навучання, па якіх залічэнне ажыццяўлялася па выніках ЦТ, маюць прахадны бал больш за 300. Выпускнікоў ліцэяў і гімназій сярод першакурснікаў — 1135 чалавек.

Студэнтамі БДУ сталі 85 абітурыентаў, якія атрымалі на ЦТ стабальны вынік, што склала 26 % ад агульнай колькасці стабальнікаў. З іх два абітурыенты маюць два сертыфікаты найвышэйшай пробы. Найбольшая колькасць прадстаўленых у БДУ сертыфікатаў з максімальным балам — па матэматыцы (27). Па беларускай мове ў прыёмную камісію было пададзена 13 стабальных сертыфікатаў, па англійскай — 12.

Абітурыентаў, якія скончылі сярэднюю школу з медалём або сярэдня спецыяльныя навучальныя ўстановы з дыпломам з адзнакай, — 609 (28,6% ад агульнай колькасці прынятых). Сярод першакурснікаў БДУ таксама 75 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд.

Нагадаем, што сёлета БДУ ўпершыню ажыццявіў набор у Сумесны беларуска-кітайскі інстытут БДУ і Даляньскага політэхнічнага ўніверсітэта (ДПУ). На спецыяльнасці «фізіка (кірунак — вытворчая дзейнасць)» прахадны бал склаў 322, а на спецыяльнасці «механіка і матэматычнае мадэляванне» — 305.

Сярод творчых спецыяльнасцяў самы высокі конкурс (па колькасці пададзеных заяў) атрымаўся на «дызайне» (кірунак — камунікатыўны дызайн) — 17 чалавек на месца.

Самыя высокія прахадныя балы на прыродазнаўчых спецыяльнасцях былі зафіксаваны на «прыкладной інфарматыцы» — 364 (у 2018 годзе — 371); «інфарматыцы» — 353 (у 2018 годзе — 364); «хіміі лекавых злучэнняў» — 349 (у 2018 годзе — 356).

На дзённую платную форму навучання залічана 1937 абітурыентаў. Сярэдні конкурс па ўніверсітэце склаў 1,4 чалавека на месца. Сярод іх 180 чалавек скончылі сярэднюю школу з медалём альбо ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі з дыпломамі з адзнакай. Больш за 300 балаў маюць амаль 45 працэнтаў залічаных на платную форму.

На завочную платную форму залічаны 707 абітурыентаў. Сярэдні конкурс — 1,8 чалавека на месца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Добрая навіна

## ВЯЛІКІ БІЯТЛОН ЦЯПЕР І Ў ГОМЕЛІ

Суперсучасную лыжаролерную трасу адкрылі ў горадзе над Сожам



**Пад спартыўны аб'ект выдзелілі вялікі ўчастак на беразе вяслярнага канала. Працягласць трасы — адзін кіламетр, шырыня — чатыры метры, ёсць дзве горкі вышынёй да пяці метраў, металічныя зборна-разборныя трыбуны для 500 гледачоў, стрэльбішча на 24 мішэні, камфортныя памяшканні для суддзяў і спартсменаў. Па перыметры трасы ўладкавана асвятленне і відэаназіранне, сістэма, якая забяспечвае штучны снег. Для навучальна-трэніравальнага працэсу і аказання паслуг насельніцтву закуплены лыжаролеры з чаравікамі.**

Разынкай комплексу стаў напалову адкрыты біятлонны цір. Ён абсталяваны спецыяльнымі ахоўнымі гумавымі экранамі — каб кулі не давалі рыкашэту. **Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ** назваў біятлонны комплекс знакавым для жыхароў рэгіёна:

— Асабліва прыемна адзначыць, што адкрыццё трасы супала з прыняццем указа Прэзідэнта, паводле якога школьнікі і выхаванцы спартыўных школ могуць праводзіць арганізаваныя заняткі на такіх фізкультурна-спартыўных збудаваннях бясплатна.

Падарункам ад Міністэрства спорту і турызму стаў сертыфікат на Br10 тысяч на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы гомельскага комплексу. Вінтоўкамі, трэнажорамі і іншым неабходным абсталяваннем на Br11 тысяч забяспечыла Беларуская федэрацыя біятлона.

Дарэчы, будаўніцтва лыжаролернай трасы ў Гомелі пачалося пасля нарады па развіцці зімовых відаў спорту, калі Прэзідэнт арыентаваў рэгіёны на ўдасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы. Біятлонны комплекс узвялі за два месяцы. Тэрміны, лічаць у Беларускай федэрацыі біятлона, рэкордныя. У выніку атрымаўся ідэальны аб'ект для юніёраў.

У дзень адкрыцця траса прыняла юных удзельнікаў першага этапу Кубка Беларускай федэрацыі біятлона сярод юнакоў і дзяўчат 2001—2008 гадоў нараджэння.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**

## СТАРЫ АТРАКЦЫЁН АДПАЧЫНАК НЕ САПСУЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Разам з тым гэта не азначае таго, што ветэраны атракцыённага парку могуць эксплуатавацца да бясконцасці. Акрамя фізічнага зносу, існуе яшчэ і маральны. Напрыклад, некаторыя агрэгаты за дзесяцігоддзі ўжо надакучылі карыстальнікам. А гэта ў сваю чаргу будзе негатыўна адбівацца на выручцы. Таму яшчэ ў 2011 годзе былі распрацаваны графікі вываду старых агрэгатаў з эксплуатацыі. Усяго «на пенсію» планавалася адправіць 116 машын, прычым да канца гэтага года 105. Але, па звестках Дзяржпрамнагляду, фактычна выведзены з эксплуатацыі ўсяго 49.

— Напрыклад, на нашым балансе знаходзіцца 53 атракцыёны, — расказвае **начальнік упраўлення «Гарадскія паркі» УП «Мінскзеленбуд» Андрэй ЖЫХАРАЎ.** — Пры гэтым істотная частка з іх эксплуатуецца больш за дзесяць гадоў. Але гэта не кажа пра тое, што іх трэба тут жа спісваць, — яны праходзяць абслугоўванне згодна з рэгламентам работ. Зразумела, у планах нашай арганізацыі — абнаўленне тэхнічнага парку, але цана пытання вельмі дарагая. За кошт уласных сродкаў гэта складана зрабіць. Таму апошнім часам мы закупляем надзіманыя комплексы і лабірынты.

Як паведаміў Андрэй Жыхараў, цяпер новы механізаваны атракцыён каштуе 100 тысяч еўра ў эквіваленце. І гаворка ідзе яшчэ пра адносна прасценькі з тэхнічнага пункту гледжання і адпаведна танны комплекс. А вось надзіманы каштуе значна танней — каля 20 тысяч долараў у эквіваленце.

Разам з тым, асноўная прычына няшчасных выпадкаў на атракцыёнах — не іх фізічны стан, а памылкі персаналу.

— Яны часам недастаткова падрыхтаваныя, не ўмеюць дзейнічаць у няштатных сітуацыях, недысцыплінаваныя, — пералічвае заганы Пётр Клімко. — Дзесьці не дагледзелі, там рэмень не прышпілілі, не тую кнопку націснулі... Сваю ролю адыгрывае і велізарная цякучасць дзяжурных атракцыёнаў. Некаторыя ўладальнікі агрэгатаў кажуць, што на працягу сезона склад дзяжурных можа абнаўляцца па розных прычынах нават двойчы. А што тады казаць пра іх належную практычную падрыхтоўку?

Але разам з тым за апошнія дзесяць гадоў пры эксплуатацыі атракцыёнаў няшчасных выпадкаў з пасажырамі, якія прывялі да цяжкіх траўмаў і смерці, не зафіксавана.

— У нас летась быў інцыдэнт у парку Чалюскінцаў з атракцыёнам «Калабок», — згадвае Пётр Клімко. — Разбурыўся адзін з прывадных валаў. Атракцыён спыніўся, пасажыры не пацярпелі. Мы разабраліся ў прычынах. Такіх атракцыёнаў у Беларусі было тры. Мы іх усе дадаткова абследавалі ў пазачарговым парадку. Разам з тым трэба адзначыць, што пасажыры часам самі не зважаюць на элементарныя правілы бяспекі.

Тым часам стала вядома, што ў сталічным парку Чалюскінцаў з'явяцца новыя атракцыёны для дзяцей. Гэта будуць трохузроўневы «Лабірынт» памерам 6 на 13 метраў, надзіманы комплекс «Саванна», міні-джэт і батут. Акрамя таго, там часова знойдзе прыстанак «Віртуальны тэлепорт». Пакуль ён узяты ў арэнду. Калі атракцыён спадабаецца мінчанам і гасцям сталіцы, то яго ўсталююць у парку Горкага.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Здарэнне

## Зваліўся з трэцяга паверха на арматуру

**Увечары на «101» паступіла паведамленне пра падзенне чалавека на арматуру на вуліцы Аладавых у сталіцы.**

Па інфармацыі МНС, пры правядзенні будаўніча-мантажных работ на паркінгу, які будуецца, адбылося падзенне рабочага з трэцяга паверха на выступаючую арматуру другога паверха будынка.

Для таго каб зняць пацярпелага, ратавальнікам, якія прыбылі на месца здарэння, неабходна было зафіксаваць мужчыну, акуратна зрэзаць пруты арматуры і толькі потым спусціць яго на зямлю.

Работнікі МНС пры дапамозе адмысловай прылады абрэзалі арматуру і перадалі мужчыну брыгадзе медыкаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**





# ШПАЦЫР ПА «БРАЗІЛЬСКАЙ» КАСТРЫЧНІЦКАЙ



Гэтыя выхадныя былі, бадай, самыя фестывальныя з усіх фестывальных субот і нядзель. Напрыклад, у Іванаўскім раёне ў вёсцы Моталь прайшоў кулінарны фэст «Мотальскія прысмакі», у Шклове адзначылі «Дзень агурка», у Бярозаўскім раёне — «Спораўскія сенакосы», а ў Докшыцах — «Фестываль дзвюх рэк», у Пружанскім раёне на хутары Стулы інсцэнавалі палескае вяселле, а ў Дзісне Мёрскага раёна па старажытнай царкоўнай традыцыі неслі цудадзейны абраз Божай Маці Смаленскай Адзігітрыі. І нарэшце, сталіца, якая пабіла рэкорд па святкаваннях: у Лошыцкім парку адзначалі 155-годдзе бровара «Аліварыя», а Мінскі заапарк запрашаў на сваё 35-годдзе. У старым горадзе сталіцы прайшоў Дзень эстонскай культуры, а на вуліцы Кастрычніцкай грымеў стрытарт-фэст «Vulica Brasil». На гэтым, апошнім, пад рытмічныя сінкопы барабаннага аркестра, сярод вясёлых эмоцый святочнага натоўпу, я разглядаў маленькія — фармату А4 і велізарныя — на ўсю сцяну завадскага корпуса графіці. І зусім нічога не разумею ў такім мастацтве, але рызыкну катэгарычна сказаць, што жывапіс на фасадах мне спадабаўся. Святам «Vulica Brasil» закрываўся чарговы беларуска-бразільскі фестываль па вонкавым роспісе сталічных будынкаў.

**Анатоль КЛЯШЧУК,**
**фота аўтара.**






ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

**Продавец:** Кооперативно-торговое унитарное предприятие «Витебская универсальная база», юр. адрес: 211319, Витебский р-н, аг. Октябрьская, ул. Оршанская, 2, *почтовый адрес: 210001, г. Витебск, ул. Комсомольская, 31,* факс. 8 (0212) 66-42-12, 8 (029) 713-36-45

**Лот №1.** Капитальное строение с инв. № 200/С-61245 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Черняховского, 34Б площадью 154 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин по рыночной стоимости – 242 400,00 бел. руб. с НДС. Обременение: наличие ипотеки (дог. № 299-З от 30.11.2017) – согласие залогодержателя – ЦБУ № 202 в г. Витебске Региональной дирекции по Витебской области ОАО «Белагропромбанк» на продажу на торгах (исх. № 04-5-10/248 от 07.08.2019). Элементы благоустройства по рыночной стоимости 20 556,00 бел. руб. с НДС: площадка для сбора ТБО, покрытие – бетонная плитка, площадью покрытия 13,7 кв. м; ограждение площадки для сбора ТБО: забор железобетонный высотой – 1,52 м, протяженностью 8,26 м, и забор металлический высотой – 1,58 м протяженностью 2,02 м; асфальтовое покрытие с бортовым камнем: материал покрытия – асфальтобетон, площадь покрытия 363,97 кв. м, протяженность бетонного бортового дорожного камня – 103,5 м; плиточное покрытие с бортовым камнем: материал покрытия – плитка тротуарная бетонная, площадь покрытия 234,01кв. м, протяженность бетонного бортового тротуарного камня – 229,03 м. Кондиционер с установкой – 1 шт., инв. № 1891, год постановки – 10.11.2017; охранная сигнализация – 1 шт., инв. № 180811, год постановки – 08.08.2011; жалюзи-ролеты – 3 шт., инв. №№ 111205, 111206, 111207, год постановки – 11.11.2012, по рыночной стоимости 2 883,60 бел. руб. с НДС за 5 единиц. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым № 240100000003003574 площадью 0,2054 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Черняховского, 34Б.
**Нач. цена:** 265 839,60 бел. руб. с НДС**. Задаток:** 26 583,96 бел. руб.

**Лот № 2.** Капитальное строение с инв. № 200/С-52046 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, п. Витьба, ул. Центральная, 5 площадью 297 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин по рыночной стоимости 126 960,00 бел. руб. с НДС. Кондиционер BALLU BCFB/IN-60H – 2 ед., 2012 г. в., инв. №№ 121285, 1212998 по рыночной стоимости 5 568,00 бел. руб. с НДС за 2 ед. Имущество расположено на земельном участке с кадастровым № 221280603601000077 площадью 0,1518 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, п. Витьба, ул. Центральная, 5.
**Нач. цена:** 132 528,00 бел. руб. с НДС**. Задаток:** 13 252,80 бел. руб.

**Лот № 3.** Капитальное строение с инв. № 200/С-51923 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, аг. Новка, ул. Сметанина 3 площадью 188,2 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин «Продукты», расположенное на земельном участке с кадастровым № 221287012101000115 площадью 0,0895 га.
**Нач. цена:** 91 920,00 бел. руб. с НДС**. Задаток:** 9 192,00 бел. руб.

**Торги проводятся:** 13.09.2019 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и подачи заявлений на участие в торгах:** с 13.08.2019 с 8.30 по 12.09.2019 до 17.30. Условие аукциона: победитель торгов (единственный участник торгов) обязан: в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона перечислить затраты на организацию и проведение аукциона и затраты по оценке имущества на р/счет, указанный в протоколе аукциона; в течение 20 календарных дней со дня проведения аукциона заключить договор купли-продажи, оплатить предмет аукциона в сроки, указанные в договоре купли-продажи. Оплата расходов по гос. регистрации договора купли-продажи и объектов недвижимого имущества осуществляется за счет Покупателя

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением правления Витебского облпотребсоюза от 14.09.2018 № 247. Для участия в аукционе представляются документы: заявление на участие в аукционе, заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка, копия документа, подтверждающего гос. регистрацию (для юр. лица, индивидуального предпринимателя); юр. лицами – резидентами РБ: копии учредительных документов и копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юр.лица; юр. лицами – нерезидентами РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (не ранее чем за 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения и документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; заключается соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. При подаче документов физ. лицо, представитель физ. лица и юр. лица предъявляет документ, удостоверяющий личность, документ подтверждающий полномочия лица на представление интересов. Осмотр предметов торгов осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по месту нахождения имущества. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. **Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа – ККУП «Витебский областной центр маркетинга»**. Организатор аукциона вправе не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информация по тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (29) 7133645, 66-42-12



**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «НОВАЯ ЖИЗНЬ» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **здание бани, инв. № 621/С-1026125, общей площадью 175,2 кв. м, расположенное на земельных участках с кадастровыми номерами 624281303601000167 и 624281303601000168, площадью 0,1315 га и 0,1033 га соответственно, по адресу: Минская область, Несвижский район, Козловский с/с, д. Козлы, пер. Полевой, 3.**

**Начальная цена с НДС (20 %) – 5 591,53 бел. руб. Стоимость снижена на 80 %. Задаток 10 % от начальной цены – 559,15 бел. руб., перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона возмещает Организатору аукциона затраты на организацию и проведение результативного аукциона. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 09.07.2019. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **27.08.2019** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.08.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**



**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(организатор аукциона)* по поручению **ОАО «Борисовская швейная фабрика»** (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **изолированного помещения** общ. пл. 3 992,4 кв.м, инв. № 610/D-65612 по адресу: **г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/1-3,** и имущества согласно перечня *(с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов)*.

Начальная цена с НДС (20 %) – **89 981,08** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **16 619,00** бел. руб. ***Стоимость недвижимого имущества снижена на 90 %, стоимость имущества снижена на 80 %.***

Шаг аукциона – 5 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 31.05.2019. Аукцион состоится **26.08.2019 в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.08.2019 до 16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

# DOLCE VITA ПА-БЕЛАРУСКУ

## СМАЧНЫ ПРЫГАВОР

Ідзеш на інтэрв'ю на кандытарскую фабрыку і ў якасці героіні чакаеш убачыць самавітую жанчыну сярэдніх гадоў у чапцы. Але насуперак стэрэатыпам на прахадной нараўлянскага прадпрыемства «Чырвоны мазыранін» мяне сустракае падазрона стройная дзяўчына Вольга Піскун.

— Вы дакладна тэхнолаг? — запытваюся на ўсялякі выпадак.

— Начальнік тэхналагічнага аддзела, — удакладняе Вольга з усмешкай і, зразумеўшы, у чым хаваецца мой недавер, кажа: — Занадта худая? Дык я ж тут толькі тры гады працую!

Для тых, хто не ведае, тлумачу: тэхнолаг-кандытар займаецца і распрацоўкай новых рэцэптур, і сочыць за якасцю прадукцыі. На ім ляжыць адказнасць за сотні кіло цукерак і мармеладак, тоны зефіру і пасцілы, якія бесперапынна сыходзяць з канвеера. Менавіта тэхнолагі здымаюць пробу на розных этапах. А іх кабінет нагадвае аптэку з сотнямі скляначак і скрыняў, дзе хаваюцца самыя лепшыя «лекі» ад дрэннага настрою. Прафесія для рамантыкаў, нічога не скажаш.

***— Воля, вы займаецеся тым, пра што многія марылі ў дзяцінстве, — працуеце на кандытарскай фабрыцы. Як сюды трапілі?***

— Спецыяльна не планавала. Я сама з Мазыра, вучылася ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце харчовай прамысловасці, а сюды прыйшла на размеркаванне. Чаму б і не? У Беларусі не так шмат такіх прадпрыемстваў, мне пашчасціла трапіць на адно з іх. Нароўля — горад спакойны, да бацькоў у Мазыр можна ў любы момант паехаць. Але галоўнае — цікавая работа.

***— А мне заўсёды здавалася, што, каб прыдумляць новыя цукеркі, трэба быць вельмі вопытным спецыялістам.***

— Склад і тэхналогія стварэння класічных кандытаркіх вырабаў, па вялікім рахунку, нязменныя. Гэта стандарты, па якіх усе прадпрыемствы працуюць не адно дзесяцігоддзе. Так, зефір — гэта заўсёды цукар, яблычнае пюрэ, яечны бялок, патака, пекцін, кіслата і араматызатар. Разнастайнасць на прылаўках дасягаецца ўсемагчымымі абсыпкамі, глазурамі, дэкорам. Плюс кожная фабрыка мае свае «сакрэцікі». Таму ўважлівы пакупнік не зблытае гомельскі і мінскі грыльяж, заўважыць розніцу паміж нараўлянскім і бабруйскім зефірам.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



***— Прасіць раскрыць сакрэтныя інгрэдыенты не буду. Аднак цікава, як заставацца на рынку ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі. Гэта ж трэба пастаянна генерыраваць новыя ідэі!***

— Трэба, але яны павінны ўпісвацца ў канцэпцыю прадпрыемства. Толькі на першы погляд здаецца, што палёт фантазіі кандытара ў наш час бязмежны. Але гэта не зусім так. Напрыклад, «фішка» нашай фабрыкі — натуральнасць. Гэта для мяне вельмі ўскладняе падбор інгрэдыентаў для новых рэцэптаў.

Справа ў тым, што сёння вялікія прадпрыемствы імкнуцца зрабіць цукерку таннай. Таму і дадаюць у састаў сінтэтычныя загушчальнікі, стабілізатары, эмульгатары і далей па спісе. Часам зірнеш на зваротны бок абгорткі і можаш убачыць паўтабліцы Мендзялеева.

## САЛОДКІЯ ФОРМЫ І ФОРМУЛЫ

***— Як нараджаецца новая цукерка? Ці ёсць на масавай вытворчасці месца індывідуальнаму натхненню?***

— Усё даволі празаічна. На фабрыцы ёсць экспертна-мастацкі савет (у яго ўваходзяць супрацоўнікі ўсіх аддзелаў), дзе дэгустуюць навінкі, выстаўляюць адзнакі і вырашаюць — ставім на лінію ці не. Але ўсё пачынаецца з ідэі. Іх, як правіла, генеруюць маркетолагі: яны часта ездзяць на прафесійныя форумы і выстаўкі, каштуюць замежную прадукцыю, трымаюць сувязь з калегамі. Як толькі ім трапляецца нешта незвычайнае, чаго няма на беларускім рынку, яны прыходзяць у наш аддзел. Задача тэхнолагаў — распрацаваць рэцэптуру, прадумаць знешні выгляд прадукта, але самае галоўнае — увасобіць гэта на нашым абсталяванні. Адна справа, калі дома ў печцы фруктовую пасцілу сушыш, іншая — у цэху. Або думалі неяк зрабіць зефір з сушанымі ягадамі. Смаката і выглядае прыгожа! Аднак чарніцы не праходзілі праз галоўкі, якія адсаджваюць зефір на лінію.

***— Атрымліваецца, нават цяпер машына можа справіцца не з усім?***

— Зразумела! Ручной працы хапае. Па-першае, далёка не ўсё абсталяванне фабрыкі новае. Працэс стварэння вядомых усім яшчэ з савецкіх часоў мармеладных долек такі: асобна фарміруецца сарцавіна, якая толькі пасля пакрываецца скарынкай, і гэта робяць рукамі. Машына толькі наразае. Сабраць і адправіць на сушку — зноў жа справа людзей. Па-другое, пакупнікі сёння капрызныя. Хочуць не проста смачную і натуральную, але і прыгожую цукерку. Як, думаеце, робяць зефір у абсыпцы на глазуры? Толькі рукамі, прычым так, каб спажывец нават не заўважыў, што яго трымалі спецыяльнымі відэльцамі. Адно радуе — цяпер не трэба рукамі ўзбіваць «птушынае малако».

***— Нават суфле ручное?***

— Да з'яўлення новай аўтаматычнай лінейкі нашы кандытары рукамі ўзбівалі па 20 кілаграмаў масы. Вельмі доўга і цяжка фізічна. Але што такое 20 кіло цукерак? Кропля ў моры!

***— Як выбіраюцца складнікі?***

— Два разы ў год на тэндарнай аснове. Да нас прыходзяць так званыя пробнікі — невялікая колькасць прадуктаў, якія мы тэсціруем, а пасля адбіраем лепшыя. На жаль, не ўся сыравіна беларуская. Пекцін у нас увогуле не вырабляюць, таму закупляем яго ў кітайцаў, іспанцаў. Патака — літоўская. Бялок — польскі або расійскі. Агар адтуль жа. Шакаладная глазура — пакуль украінская, беларуская занадта цякучая, але спадзяёмся, што ў хуткім часе нешта зменіцца. Бо, вядома, мы зацікаўленыя ў сваім. Аснова для любога кандытарскага вырабу — цукар — у нас айчынны.

***— Калі пэўных інгрэдыентаў у Беларусі няма, як жа без іх абыходзіліся раней, у савецкі час?***

— Для прыкладу возьмем пекцін. Ён утрымліваецца ў садавіне і выкарыстоўваецца ў якасці натуральнага загушчальніка. Раней, калі не было спецыяльных тэхналогій, якія яго выціскалі з яблыкаў і цытрусавых, у зефір проста клалі шмат яблычнага пюрэ. Аднак ад гэтага колер ласунка быў рудаваты, ды даводзілася шмат часу губляць на чаканне, пакуль зефірынкі прымуць пэўную форму. Цяпер увесь працэс займае каля 40 хвілін. Папярэдняя пакаленні кандытараў пра такое маглі толькі марыць.

***— Колькі часу праходзіць ад ідэі да масавай вытворчасці?***

— Некалькі месяцаў. Акрамя самой распрацоўкі, трэба прайсці тэсты ў лабараторыі, аформіць дакументы. Асаблівая ўвага надаецца выяўленню тэрміну захавання прадукту.

## ЦУКРОВЫЯ ЖАРСЦІ

***— Вы той чалавек, які дакладна ведае, з чаго і як робяцца цукеркі. Якія самыя любімыя?***

— У першыя месяцы работы хацелася пакаштаваць усё, таму я пасмакавала 150 найменняў. Цяпер мяне нічым не здзівіць. Радасці мала, калі трэба кожную варку (раз у гадзіну) падыходзіць і спрабаваць кандытарскую масу. Разам з тым я адданы фанат класічнай «Кароўкі». Адкусваеш, а яна аж цягнецца знутры! Дарэчы, дасягнуць такога эфекту няпроста, асабліва з натуральнымі інгрэдыентамі. Цукар пачынае крышталізавацца ўжо праз месяц, а тэрмін захоўвання цукеркі — тры. Заўсёды ёсць рызыка нарвацца на быццам не зусім свежы прадукт.

Не так даўно сумесна з Навукова-практычным цэнтрам харчовай прамысловасці Акадэміі навук мы распрацавалі рэцэптуру цукерак з запаволеным працэсам чарсцвення. Дадалі алігафруктозу і біінверт (прыродны полісахарыд. — **Аўт.**), і гэта дало пэўныя вынікі. Хоць, безумоўна, са штучнымі дабаўкамі ў гэтым плане было б прасцей.

***— Чаго варта баяцца ў саставе кандытарскіх вырабаў? Толькі шчыра!***

— Нельга сказаць адназначна. Ёсць стандарты, якія рэгламентуюць дапушчальную канцэнтрацыю тых ці іншых рэчываў, без якіх складанна абысціся сучаснаму кандытару. Скажам, пакупнікі ахвотней бяруць ласункі яркіх колераў. Але мала хто задумваецца, што такі эфект можна дасягнуць толькі сінтэтычнымі фарбавальнікамі. Хоць гэта не самае страшнае.

На беларускіх прылаўках даволі шмат прадукцыі з суседніх краін, дзе стандарты на састаў дужа адрозніваюцца ад нашых. Таму прывазныя цукеркі, печыва, зефір у разы таннейшыя! Але дастаткова зірнуць у складнік — і ўбачыш спіс з некалькіх дзясяткаў інгрэдыентаў, што само па сабе не можа быць нормай.

***— У наш час стала модна адмаўляцца то ад мяса, то ад цукру.***

— Трэнды прыходзяць і сыходзяць, а салодкага хочацца заўсёды! *(Смяецца.)* Дарэчы, не так даўно патэлефанаваў мужчына з Піншчыны і сказаў, што ў нас прадукцыя «занадта салодкая». Пачалі яму тлумачыць, што цукровыя кандытарскія вырабы і павінны такімі быць, а ён абурыўся: «У вас там яшчэ і цукар?!» Гэта тое ж самае, калі б ён здзівіўся наяўнасці мяса ў стэйку. Да такіх дзіўных разважанняў людзей якраз прыводзіць мода і не зусім праўдзівы маркетынг. Пастаўшчыкі неяк прапаноўвалі нам клятчатку для зефіру. Маўляў, сёння гэта модна, можна дадаць яе ў састаў і напісаць на ўпакоўцы, што прадукт «фітнэс» і «эка». Яно, канешне, можна, але навошта людзям дурыць галаву? Зефір, ён і ў Афрыцы зефір.

**Ганна КУРАК, фота аўтара.**
*г. Нароўля.*

---

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ХАЛАДНІЧОК ПАД КНЫШЫ

**З 19 да 25 жніўня пройдзе чарговы, 20-ы па ліку, Тыдзень беларускай кухні, у якім прымуць удзел 50 аб'ектаў грамадскага харчавання розных формаў уласнасці, паведамляе галоўнае ўпраўленне спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

У рамках правядзення Тыдня беларускай кухні гасцям будуць прапанаваныя пяць страў нацыянальнай кухні. Гэта агурочны халаднік за 2,5 рубля, рыбныя галкі за 10 рублёў, шупеня са свініной за 7,5 рубля, кнышы з бульбай і грыбамі за 4,5 рубля, сырнікі са смятаннамакавым соусам за 5 рублёў.

Стравы будуць гатавацца па адзіных рэцэптурах і рэалізоўвацца па аднолькавых цэнах. Самі яны распрацаваны з удзелам пераможцаў гарадскога конкурсу прафесійнага майстэрства «Мінскі майстар — 2019».

## МУЗЫЧНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ — У ЛАМБАРД

**25-гадовы грамадзянін Азербайджана на працягу трох месяцаў браў у арэнду музычныя інструменты, не маючы намеру іх аддаваць. Сума шкоды склала больш за 2,5 тысячы долараў.**

Малады чалавек, працуючы ў сталічным клубе ды-джэем, вырашыў падзарабіць на музычнай апаратуры. Ён браў інструменты ў арэнду, а потым іх перапрадаваў. Арэндадаўцаў зламыснік выбіраў не выпадкова: па прычыне доўгага супрацоўніцтва з ім і асабістага даверу кампаніі давалі зламысніку апаратуру без дамовы. Атрымаўшы неабходную тэхніку, малады чалавек адразу ж накіроўваўся ў ламбарды сталіцы, дзе і здаваў яе.

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, вядома, што частку арандаванага мужчына перапрадаваў у Расійскую Федэрацыю. Ад дзеянняў фігуранта пацярпела мінімум шэсць грамадзян. Устаноўлена, што атрыманыя грошы зламыснік марнаваў у казіно.

## РАБІЎ СТАЎКІ З ЧУЖОЙ КАРТКІ

**У сталічную міліцыю звярнуўся малады чалавек з заявай пра тое, што ў момант, калі ён не выкарыстоўвае банкаўскую картку, з яе знікаюць грашовыя сродкі. Мінчанін патлумачыў, што раней ён нікому не перадаваў сваю картку і не выдаваў з яе асабістыя звесткі. Аднак прыгадаў, што, жывучы ў інтэрнаце, мог перыядычна пакідаць свае асабістыя рэчы ў незачыненым пакоі і сыходзіць па справах.**

Аператыўнікі групы па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій устанавілі, што прычынай знікнення грашовых сродкаў паслужыла прывязка карткі да аднаго з акаўнтаў анлайн-казіно. Як пазней стала вядома, ўладальнікам уліковага запісу аказаўся 19-гадовы сусед пацярпелага.

Па інфармацыі Маскоўскага РУУС сталіцы, фігурант прызнаўся ў зробленым, а таксама расказаў, што, калі ў адзін з дзён пацярпелы адышоў па справах, ён убачыў адчыненыя ў пакой дзверы, а на стале — банкаўскую картку. Сусед сфатаграфаваў яе даныя, а пасля прывязаў да асабістага акаўнта анлайн-казіно і неадназова выкарыстоўваў грашовыя сродкі, каб рабіць стаўкі і гуляць. Агульная сума шкоды склала каля 500 рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КАМУ МІГЦЯЦЬ АГНІ ПРЫТОНАЎ?

**У пачатку жніўня па ўсёй краіне праводзілася акцыя «Побыт». Яна ставіла сваёй мэтай прафілактыку злачынстваў у сем'ях. Сярод іншага, міліцыянеры адпрацоўвалі і прытоны. Карэспандэнты «Звязды» таксама выйшлі ў рэйд.**

## КРЫВАВАЯ ДРАМА Ў МІНСКАЙ «ХРУШЧОЎЦЫ»

Наш рэйд пачынаецца з пяціпавярховак у раёне вуліцы Альшэўскага.

— Раён тут даволі спецыфічны, — адзначае **начальнік аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Фрунзенскага РАУС Павел ПУНЧЫК.** — Мой былы ўчастак. Можа, мяне і згадаюць... Зараз мы кіруемся ў кватэру, дзе літаральна на днях адбылося цяжкае злачынства. Суседзі шмат скардзяцца на гаспадароў гэтага жылля. П'янкі-гулянкі там ледзь не штодня. У тым ліку і на вуліцы.

Алкаголь і рэўнасць — штука, мякка кажучы, тэрмаядзерная. Так адбылося і ў двухпавярховай кватэры на першым паверсе «хрушчоўкі». Да гаспадара кватэры прыйшла жанчына разам са сваім сужыцелем і сяброўкай. У нейкі момант тая падумала, што яе сяброўка хоча звесці ў яе сужыцеля. У руках апынуўся нож... Ахвяру адправілі з цяжкімі цялеснымі пашкоджаннямі ў рэанімацыю, ну а сама нападніца паехала пад варту.

У самой кватэры, аднак, нішто не нагадвала пра крывавую драму. Гаспадар кватэры выпіў і мірна спаў. Некалькі гасцей глядзелі тэлевізар. А ў паветры адчуваўся моцны пах спіртнога. Што цікава, на ўвесь велізарны халадзільнік знайшлося толькі некалькі яек і шакаладка.

Жанчына кажа, што пакуль перасялілася да сваіх знаёмых. Калі яна адбывала чарговы адміністрацыйны арышт, нехта разбіў шыбу і ўлез праз акно. Камунальнікі пасля закалацілі раму дошкамі, а ўчастковы міліцыянер апячатаў кватэру. Плюс у яе вялікая запазычанасць за жыллёва-камунальныя паслугі.

Але відавочна, што Павел Пунчык ведае яе. Цікавімся: адкуль?

— Яна ж абавязаная асоба. Ужо даўно нідзе стала не працуе. Арышт за арыштам. Дзяржава дзяцей забрала яшчэ гадоў шэсць таму. Наш, так бы мовіць, «сталы» кліент.

Разам з участковым міліцыянерам двое гасцей «вясёлай» кватэры адпраўляюцца ў апорны пункт аховы правапарадку для высвятлення асобы. Таксама трэба давядацца, у якім стане яны прыйшлі ў кватэру. Калі нецвярозымі, то для іх тады надыдзе адказнасць па пункце 17.3 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях за з'яўленне п'янымі ў грамадскім месцы.

Пытаюся ў суразмоўцы: ці бываюць выпадкі, калі чалавек п'янствуе, а пасля бярэцца за галаву?

— Мне вядомы толькі адзін выпадак. Гады чатыры таму жанчыну пазбавілі мацярынскіх правоў. Да гэтага ў яе стала былі п'янкі, а восем трох дзяцей глядзець лічыла залішнім для сябе. Апускалася ўсё ніжэй і ніжэй. Двойчы ездзіла ў лячэбна-працоўны прафілакторый. Але нешта ў яе светапоглядзе змянілася. Раптоўна перастала піць. Навяла парадак у кватэры. Уладкавалася на работу, выплаціла ўсю запазычанасць. І цяпер жыве сціпла, але цалкам годна. Вось гэта сіла волі. Як яна тлумачыла, проста стамілася... А пераважная большасць ні пра што наперад не думае. Як гаворыцца, з раніцы выпіў — і вольны.

## ЭХ, ВАСІЛЬ...

А мы кіруемся тым часам у сталічны мікраараён Захад. Трохпакаёвая кватэра на вуліцы Якубоўскага ў Мінску ператворана ў прыстанак для людзей, які іх афіцыйна па-значаюць, з нізкай сацыяльнай адказнасцю. Вада, святло там даўно адключаны. Запазычанасць вялікая і ці пагасіцца — невядома. Гаспадар кватэры, Васіль, працуе грузчыкам на адным са сталічных рынкаў.



Сюрпрызы пачынаюцца з дзвярэй у кватэру. Замест замка гаспадар прыстасаваў... зубіла. Прычым гэта нават прагрэс, раней дзверы былі проста прыстаўлены да праёма. Як спявалася, «прыходзьце ў мой дом, мае дзверы адчынены...»




У самой жа кватэры адчуваецца нейкі непрыемны пах. У пакоях — склад брудных лахманоў. Затое нечакана знайшліся кнігі. Прычым гэта адносна новыя міліцэйскія раманы, выдадзеныя ў Расіі. Шпалеры, калі яны і былі паклеены на сцены, даўно сатлелі ад старасці. На пытанне, дзе гаспадар бярэ ваду, ён адказвае, што ў калонцы. Але дзе знайсці калонку сярод квартала шматпавярховак — пытанне. А ў якасці прыбіральні ён даўно асвоіў санвузел у найбліжэйшым траўмапункце. Знаходлівасць, аднак!

Васіль у кватэры быў не адзін.

— Ды я сюды ў госці зайшоў, — кажа госць.

— Ой, глядзіце. Тут жа антысанітарыя жудасная. Ды і месяц таму вы мне тое ж самае казалі.

Госць сарамліва апускае вочы...

— Васіль, вось скажыце адну простую рэч, — звяртаецца ўчастковы **інспектар гарадскога аддзела міліцыі № 2 Фрунзенскага раёна Яўген МІХАЛОЎСКІ.** — Як доўга яшчэ думаеце так жыць? У вас жа добрая кватэра. Кіньце вы алкаголь, выплаціце запазычанасць і жывіце, як звычайныя людзі.



Але Васіль не знаходзіць, што адказаць...

Тут жывуць тры чалавекі — сам Васіль, яго сужыцелька і яе сястра. Апошняя цяпер знаходзіцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі. Кватэра Васілю дасталася ад бацькоў, якія памерлі.

## «СПАРТА» НА КАМЕННАЙ ГОРЦЫ

А вось трэцяя кватэра, якую мы наведалі, шчыра кажучы, непрыемна ўразіла. Знаходзіцца яна ў мікраараёне Каменная Горка. У адным з дамоў непадалёк ад МКАД кватэру атрымала шматдзетная сям'я. Ды яшчэ якую кватэру — адмыслова для яе былі аб'яднаны адна- і трохпакаёўка. Здавалася б, жыві і радуйся. Але...

У дзень нашага візіту, толькі з раніцы, органы апекі забралі з гэтай сям'і двух дзяцей у прытулак. Старэйшая дачка з бацькамі не жыве — ёй ужо споўнілася дваццаць гадоў. Ды яно і не дзіўна. Калі ў аднапакаёўцы аздабленне яшчэ прымальнае, то ў трохпакаёўцы, здаецца, разарвалася атамная бомба. Усе сцены падраныя.

Колер лінолеуму вызначыць вельмі складана. Мэбля ёсць толькі на кухні, ды і тое гэта невялікая раздзяўбаная і заляпаная белай фарбай шафка, якая, пэўна, яшчэ бачыла часы Брэжнева. А тое, на чым спаў адзінаццацігадовы малы... Уявіце сабе два пастаўленыя сядушкамі адно да аднаго невялікія крэсельцы. Паміж імі — нейкі цюк. Наверсе — матрац даўно не першай свежасці. Коўдру адшукаць не атрымалася. Дзе праводзіла ноч другое дзіця, мы так і не зразумелі. У халадзільніку ж — пустэча... Святло ў трохпакаёўцы таксама адключана.



Сапраўдныя спартанскія ўмовы. І, як сімвал крайнасці, адзінокі плюшавы мішка, якога нехта прытуліў за гэтым «ложкам»...



Кемлівы гаспадар прыкрыў гару смецця знятымі дзвярыма. Але яны таксама ў жахлівым стане, калі ўлічыць, што ім сама больш дзесяць гадоў. Праўда, ён сцвярджае, што цяпер у кватэры ідзе рамонт. Але ў гэта верыцца з вялікай складанасцю...

Зрэшты, наша наведванне пачалося не з гэтага. Мы трапілі ў кватэру акурат падчас застолля, якое ледзь не скончылася пажарам. Хтосьці з пасядзельцаў паставіў на газавую пліту электрычны чайнік. І калі пасля троххвіліннага грукату дзверы ў тамбур усё ж адчыніліся, адтуль патыхнула моцным непрыемным пахам падгарэлай пластмасы.

— А тэлевізар можна паглядзець? — пытаецца падчас абыходу кватэры Павел Пунчык. — Ён паварочвае корпус ад яшчэ кінескопнага апарата, які стаіць на халадзільніку, і... аказваецца, што ніякай начынкі пад ім няма.

— Ну, не паспелі выкінуць, — тлумачыць гаспадар.

Аднак навошта яму склад нейкіх лахманоў і пакетаў у туалеце, патлумачыць так і не змог.

— Да мы тут жылі, усё было добра. Пасля сваяк наш вызваліўся са спецшколы. Ісці яму не было куды. Пасялілі сюды. А ён гэта ўсё і нарабіў.

— Ужываеце?

— Не п'янствую! — з гонарам адказвае гаспадар. — Культурна, як і ўсе нармальныя людзі. Я не алкаш, не выпівоха.

— Калі будзе рамонт?

— Праз дзень.

— А грошы ёсць?

— У маці вазьму ў доўг...

Праўда, праз секунду прызнаецца, што адзіная крыніца даходаў у маці — сціплая пенсія ў 450 рублёў.

— Ды я і сам зарабляю. Магу атрымаць за дзень і да ста долараў.

— Індывідуальны прадпрымальнік? — здзіўляецца Павел Пунчык.

— Не. Я ў фірме працую, якая дэмантажнымі працамі займаецца. Тут у нас можа быць за дзень як тры рублі, так і дзвесце.

Як высветлілася, шматдзетныя бацькі разам не жывуць. Жонка сышла да іншага мужчыны амаль паўгода таму. Але ў гэты дзень мы яе заспелі якраз па ранейшым адрасе.

— Пазнаёміліся мы вельмі даўно, у 1996-м, — з рамантычнай настальгіяй падлічвае гады мужчына. — Нас звёў агульны знаёмы. Мы сышліся. У 1998-м ажаніліся, у нас дачка нарадзілася. Цяпер яна знайшла сабе іншага. Ну, пэўна, ёй будзе лепш...

— А ў халадзільніку пуста. Чым дзеці харчаваліся?

— Ды чым... Пельменямі з каўбасой. Ну і хлеб быў, — адказвае маці.

Як кажа гаспадар кватэры, яму паабяцалі, што калі ён зробіць рамонт у кватэры, то дзяцей вернуць назад. Ці здарыцца гэта — пытанне адкрытае.

— Мы вельмі ўдзячны людзям, якія паведамляюць пра дзяцей, якія знаходзяцца ў такіх умовах, — кажа Павел Пунчык. — Дзесьці вось і не паспяваем дайсці своечасова з-за абыякавасці тых, хто побач. Часам проста дастаткова зняць тэлефонную трубку, набраць нумар 102. І гэтым званком можна часам прадухіліць больш цяжкае злачынства.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «СМТ №41», Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Гагарина, 24 |

**Предмет аукциона (одним лотом)**
**Месторасположение: Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 17**

| Наименование объектов | Назначение | Общая площадь кв. м | Инвентарный номер | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|---|
| **Административно-бытовой корпус** | Здание административно-хозяйственное | 2637,8 | 443/C-14916 | 17 |
| **Производственно-складской корпус** | Здание специализированное иного назначения | 5362 | 443/C-14913 | 17/1 |
| **Покрасочная камера** | | 73,4 | 443/C-14917 | 17/4 |
| Составные части и принадлежности: очистные сооружения, кирпичный сарай, бетонная площадка, резервуар, резервуар | | | | |
| **Склад кислородных баллонов** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 138,6 | 443/C-14915 | 17/2 |
| **Складские помещения** | | 258,8 | 443/C-14919 | 17/3 |
| **Склад светлых нефтепродуктов** | | 32,4 | 443/C-14918 | 17/5 |
| Составные части и принадлежности: пять подземных цистерн | | | | |
| **Внутриплощадочная электросеть** | Сооружение специализир. энергетики | 142,8 | 443/C-21971 | 17 |
| Составные части и принадлежности: 2 опоры | | | | |
| **Сети канализации** | Сооружение специализир. коммунального хозяйства | 2037,2 | 443/C-21973 | 17 |
| Составные части и принадлежности: канализация бытовая, дождевая, мехзагрязненных и краскосодержащих стоков, площадка мойки машин, очистные сооружения пойки и окраски и мойки машин, 76 колодцев | | | | |
| **Сеть водопровода** | Сооружение специализир. водохозяйствен. назначения | 1255,5 | 443/C-21972 | 17 |
| Составные части и принадлежности: водопровод хозяйственно-питьевой и противопожарный, 18 колодцев | | | | |
| **Благоустройство** | Сооружение неустановлен. назначения | 29235,2 | 443/C-21974 | 17 |
| Составные части и принадлежности: ограждение, забор ж/б и металлический, проезды, тротуары, площадки | | | | |
| **Озеленение** | - | - | - | 17 |

***Сведения о земельном участке*:** предоставлен на праве постоянного пользования пл. **5,1334** га для содержания и обслуживания зданий и сооружений

**Начальная цена с НДС 20 % – 3 707 768,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **5 (пяти) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 17.09.2019 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 16.09.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

---

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| **Продавец** | ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, пер. Восточный, 17 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| 1 | **Здание корпуса 22 (бытовая часть) (здание административно-хозяйственное)** | 6 012 кв. м | 240/C-40051 |

**Местонахождение предмета торгов:** Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Якубовского, 69

**Сведения о земельном участке**: участок общ. пл. **0,2634 га** предоставлен продавцу для обслуживания здания корпуса 22 (бытовая часть) на праве аренды до 04.03.2083 г.

**Начальная цена с НДС 20 %** — **789 600,00 белорусских рублей**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **30 (тридцать)** рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 17.09.2019** в 11.00 на ЭТП **www.ipmtorgi.by.** Аккредитованному участнику, подавшему в адрес организатора торгов пакет документов и прошедшему предварительную регистрацию, ЭТП, предоставляется время до начала торгов в режиме реального времени, для заключительной регистрации (начало заключительной регистрации за 2 часа до начала электронных торгов). В случае непрохождения регистрации участник к торгам не допускается. После прохождения регистрации участник получает доступ в аукционную комнату, где ожидает старта торгов в режиме онлайн

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация)** | **По 13.09.2019** до 17.00 ЭТП www.ipmtorgi.by |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06; auction@cpo.by** |

---

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703, офис 5 |
| **Продавец** | ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 44 743 00 30) |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Предприятие как имущественный комплекс**
**ОАО «МОТОВЕЛО»**
(регистрационный номер 0001427, свидетельство № 3420 от 4 января 2019 г.).
Состав имущества и имущественных прав см. на сайте www.cpo.by

Месторасположение производственной базы **–**
**Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, 39, район д. Лесины**

**Начальная стоимость без НДС – 128 597,50 бел. руб.** (снижена на 20 %)
Шаг аукциона без НДС – 6 429,88 бел. руб.

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом электронных торгов осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо — Чарный Дмитрий Николаевич, тел. +375 44 743 00 30 |

**Задаток 3 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение, в размере 2 % от итоговой цены продажи предмета электронных торгов, в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.2019

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия.

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 05.09.2019 в 11.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация), в т. ч. перечисления задатка: 03.09.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by |

---

Центр Промышленной Оценки
- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Копыльское районное потребительское общество, г. Копыль, пл. Ленина, 21 |

**Предмет аукциона**
Месторасположение**: Минская обл., Копыльский р-н, г. Копыль, ул. Минская, д.13Б**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Заготовительный магазин** | 248,1 кв. м | 642/C-11431 |

***Сведения о земельном участке:*** пл. **2,1974 га** предоставлен продавцу на праве долевой аренды (13/100, срок действия по 05.10.2035) для обслуживания и эксплуатации зданий и сооружений производственной базы (заготовительная контора). Ограничения (обременения): охранные зоны линий электропередачи свыше 1000 В, пл. 0,3214 га

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 20 400,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

70 % от цены продажи предмета аукциона с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачиваются в течение 3 календарных дней со дня подписания договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается в течении 1 (одного) месяца

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 29.06.2019

**Аукцион состоится 27.08.2019** в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 26.08.2019** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by**. E-mail: auction@cpo.by**

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже изолированных помещений, принадлежащих ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91» (Продавец)

**Лот № 1**: склад, с инв. № 500/D-708015508, площадь – 364,8 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 15А, пом. 2. **Начальная цена с НДС** – 103 328,02 бел. руб. **Задаток** – 10 332,80 бел. руб. **Лот № 2**: диспетчерская, инв. № 500/D-708015507, площадь – 12,6 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 15А, пом. 1. **Начальная цена с НДС** – 4 533,87 бел. руб. **Задаток** – 453,39 бел. руб. **Лот № 3:** ремонтно-производственное помещение, инв. № 500/D-708162881, площадь – 143,5 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Бабушкина, 15А-5а. **Начальная цена с НДС** – 41 730,40 бел. руб. **Задаток** – 4 173,04 бел. руб.
Капитальное строение с инвентарным номером 500/C-29007, в котором расположены изолированные помещения, находится в совместном домовладении на земельном участке с кадастровым номером 500000000004006413 площадью 0,2817 га

**Аукцион состоится 30.08.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона** – 5 %

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 30.08.2019 (ОАО «УПРАВЛЕНИЕ МЕХАНИЗАЦИИ № 91», Лот №__). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 28.08.2019 в 11.00. Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.06.2019

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, www.ino.by, e-mail: torgi@ino.by

---

**ООО «Облмехотряд» в лице ликвидатора ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» проводит торги по продаже имущества предприятия.**

Продавец: ООО «Облмехотряд» в лице ликвидатора ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК»

Организатор торгов: РУП «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь», 220030, г. Минск, ул. Берсона, 1А, ком. 513. Руководитель организатора электронных торгов – Вашемирский Максим Петрович; т. 200-64-11, т/ф. 200-95-63, 200-73-33, https://torgi.gov.by/.

Публичные торги в электронной форме в процедуре ликвидации (далее – электронные торги) будут проведены 16 сентября 2019 г., в 8.00, на электронной торговой площадке https://torgi.gov.by, окончание – 16 сентября 2019 г., 16.00.

Заявки принимаются с 14 августа 2019 г. по 15 сентября 2019 г. включительно.

Шаг аукциона 5 %.

Для участия в торгах необходимо:

1. перечислить задаток по выбранному лоту в размере 5 % от начальной цены;

2. подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте https://torgi.gov.by.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат на организацию и проведение торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения на основании представленного организатором торгов либо продавцом извещения о возмещении затрат.

Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 7 рабочих дней со дня проведения торгов.

Срок оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Более подробная информация о проведении торгов на сайте https://torgi.gov.by.

| № лота | Предмет торгов | Место нахождения | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС | Шаг торгов (5 %), бел. руб. | Сумма задатка (5 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль KIA SORENTO рег. № 2250 IC-5, 2012 года выпуска | г. Минск, пр-т Победителей, д. 101 | 23 160,00 | 1158,00 | 1158,00 |
| 2 | GAZ A22R23, инв. № 145 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 19 920,00 | 996,00 | 996,00 |
| 3 | Картофелеуборочный комбайн DR1500 GRIMME 06, инв. № 62 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 42 480,00 | 2124,00 | 2124,00 |
| 4 | МАЗ 9397, инв. № 70 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1 680,00 | 84,00 | 84,00 |
| 5 | Трактор «Беларус» 1221В, инв. № 44 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 13 920,00 | 696,00 | 696,00 |
| 6 | Трактор «Беларус» 1221В, инв. № 69 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 17 280,00 | 864,00 | 864,00 |
| 7 | Трактор «Беларус» 82.1, инв. № 85 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 14 040,00 | 702,00 | 702,00 |
| 8 | Трактор «Беларус» 82.1, инв. № 130 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 20 640,00 | 1032,00 | 1032,00 |
| 9 | Трактор «Беларус» 82.1, инв. № 131 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 23 400,00 | 1170,00 | 1170,00 |
| 10 | Опрыскиватель 600L 12M, инв. № 138 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1 680,00 | 84,00 | 84,00 |
| 11 | ПТС-7, инв. № 115 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 3 480,00 | 174,00 | 174,00 |
| 12 | ПКК-1-0100000 измельчитель, инв. № 126 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1 320,00 | 66,00 | 66,00 |
| 13 | ПКК 0350000 подборщик, инв. № 148 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 2 400, 00 | 120,00 | 120,00 |
| 14 | ПКК 0350000 подборщик, инв. № 147 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1 560,00 | 78,00 | 78,00 |
| 15 | Агрегат АДД-4004 МУ, инв. № 49 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 3 480,00 | 174,00 | 174,00 |
| 16 | Плуг полунавесной ППО-(4+1)-40К3, инв. № 118 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 4 800,00 | 240,00 | 240,00 |
| 17 | Плуг полунавесной ППО-(4+1)-40К3, инв. № 119 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 4 800,00 | 240,00 | 240,00 |
| 18 | Грабли роторные ГР-700, инв. № 128 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 9 120,00 | 456,00 | 456,00 |
| 19 | Машина для формирования гребней MR20, инв. № 7 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 2 160,00 | 108,00 | 108,00 |
| 20 | Мотопомпа Honda WBP30XT-DR-X, инв. № 114 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 480,00 | 24,00 | 24,00 |
| 21 | Окучник-культиватор-гребнеобразователь ОКГ-4,0, инв. № 104 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 2 880,00 | 144,00 | 144,00 |
| 22 | ПКК-0400000А-01 жатка для трав, инв. № 149 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 8 520,00 | 426,00 | 426,00 |
| 23 | Пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180, инв. № 142 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 10 800,00 | 540,00 | 540,00 |
| 24 | Пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180, инв. № 141 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 10 800,00 | 540,00 | 540,00 |
| 25 | Прицеп ПС-12, инв. № 110 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 7 680,00 | 384,00 | 384,00 |
| 26 | Лот № 26 в составе: - капитальное строение с инв. № 642/C-12106 (назначение – здание одноквартирного жилого дома,) на земельном участке с кадастровым номером 622881304100000001 по адресу: Минская область, Копыльский район, Тимковичский с/с, д. Новоселки, ул. Гриба, 23, - забор бетонный с сеткой металлической | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Гриба, 23 | 7 530,76 | 376,54 | 376,54 |
| 27 | Лот № 27 в составе: - капитальное строение с инв. № 642/C-30375 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения) на земельном участке с кадастровым номером 622885003001000205 по адресу: Минская область, Копыльский район, Тимковичский с/с, д. Новоселки, - капитальное строение с инв. № 642/C-11283 (назначение – здание специализированное розничной торговли) на земельном участке с кадастровым номером 622881304101000107 по адресу: Минская область, Копыльский район, Тимковичский с/с, д. Новоселки, ул. Жижика, 68В, - счетчик электрический СЕ102, - забор металлический | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 33 572,07 | 1678,60 | 1678,60 |

# СЯРЭБРАНАЯ СУМАЧКА ШЛЯХЦЯНКІ!

## Што яшчэ можна ўбачыць у Баранавічах?

**Гэты горад вядомы ўсім як буйны чыгуначны пункт. Аднак славіцца ён не толькі гэтым. У Баранавічах ёсць што паглядзець. Пра тое, на што ж варта звярнуць увагу, прыехаўшы сюды, мы спыталі ў навуковага супрацоўніка Баранавіцкага краязнаўчага музея Алены Бычко.**



### ШКАТУЛКА БАГАТАЙ ПАНЕНКІ

Найперш спадарыня Алена расказала нам пра самыя адметныя экспазіцыі і экспанаты краязнаўчага музея. Па словах спецыяліста, у іх маецца ўласны асобнік Трэцяга Статута ВКЛ. Праўда, з прычыны вялікай каштоўнасці ён не выстаўлены ў экспазіцыі — захоўваецца ў фондах.

Прадстаўлена некалькі скарбаў, знойдзеных на тэрыторыі Баранавіцкага раёна. Адзін з іх адшукалі ў вёсцы Харашкі былой Баранавіцкай вобласці ў 1957 годзе. Склад скарбу — соліды, шэлягі — манеты польскай і літоўскай чаканкі. Яны належаць да 1660-х гадоў.

«Скарб не надта каштоўны па складзе манет. Аднак уяўляе цікавасць тым, што быў знойдзены ў цэльным выглядзе, — кажа Алена Бычко. — І шмат што сведчыць пра баранавіцкі край — нагадвае, што ў свой час гэта быў важны цэнтр. Тут жылі розныя старажытныя беларускія роды: Радзівілы — у Паланечцы, у Ястрамбелі — Катлубаі, Хаткевічы — у Старой Мышы. Вельмі шмат прозвішчаў можна называць, згадваючы пра гісторыю Баранавіч XVII—XIX стагоддзяў. Напалеон Орда шмат маляваў і Паланечку, і Ішкалдзь. Хоць горада і не існавала, аднак баранавіцкі край знаходзіўся непадалёк ад Навагрудка, Нясвіжа, Міра, таму гэтая тэрыторыя засялялася вядомымі беларускімі дзеячамі».



Часта прадстаўленыя ў музеі экспазіцыі апавядаюць пра перыяд распаду Рэчы Паспалітай. Там можна ўбачыць манеты, што выходзілі ў XVII—XVIII стагоддзях па ўсёй Беларусі. Падобныя калекцыі ёсць амаль што ў кожным краязнаўчым музеі Беларусі.

«Штосьці было знойдзена пры раскопках, штосьці перададзена жыхарамі, — каментуе спецыяліст, — гэта тое, што яны захавалі ад сваіх дзядоў, прадзедаў. Некаторыя манеты людзі знаходзілі на сваіх зямельных надзелах, у лесе, а пасля аддавалі ў музей».

Адметныя рэчы — шкатулка і жаночая сумачка, зробленыя са срэбра! Гэта арыгінальныя ювелірныя вырабы, якія выкарыстоўваліся багатымі жыхарамі краю.

### ЭТНАГРАФІЧНАЯ КАЛЕКЦЫЯ

У музеі даволі адметная этнаграфічная калекцыя. Шмат драўляных вырабаў — прычым можна ўбачыць не толькі іх, але і сам дрэваапрацоўчы станок. Усе прадстаўленыя рэчы раней знаходзіліся ў жыхароў шматлікіх населеных пунктаў Баранавіччыны. А пасля па розных каналах трапілі ў музей.

«У асноўным гэтыя рэчы перадавалі самі людзі, — удакладняюць у музеі, — тое, што засталося ім ад дзядоў, бабуль, а ім самім ужо было непатрэбна».

Тут можна ўбачыць ганчарныя вырабы — збанкі, глякі, посуд, ганчарнае кола. Выстаўлены і іншыя побытавыя рэчы — бандарныя прыстасаванні, ступа, маслабойка. Таксама розныя сякеры, драўляны цыркуль. Пра ткацтва можна меркаваць па прадстаўленых тут ткацкіх чаўнаках, некаторых асобных прыладах. Цэлага ткацкага станка ў музеі няма. Прадстаўлены і розныя сельскагаспадарчыя прылады — плуг, барана, сеялка, шматлікія кошыкі.

Ёсць прыклады жаночага адзення. Аднак у баранавіцкім рэгіёне вясковых паселішчаў было не так шмат, а горад з'явіўся даволі позна, у 1871 годзе, таму ўласнага нацыянальнага строю не склалася. Тут апранала суседні, ляхавіцкі строй — яго можна ўбачыць у музеі.

### НОВЫ ВОБЛІК МУЗЕЯ

Даволі хутка ў краязнаўчым з'явіцца новая экспазіцыя. Ужо распрацоўваецца яе канцэпцыя. У найбліжэйшыя некалькі гадоў усё зменіцца. Павялічыцца аддзел беларускага народнага рамяства — некаторыя рэчы для калекцыі будуць набывацца.

Фінансаванне для абнаўлення музея выдзеляць гарадскія ўлады. Існуючая музейная экспазіцыя даволі старая, ёй ужо больш чым 20 гадоў. «Нягледзячы на яе інфарматыўнасць, па сучасных мерках яна саступае многім музеям Беларусі, — лічыць Бычко. — Таму, каб музей быў больш папулярны сярод жыхароў горада і яго гасцей, вырашылі стварыць новую экспазіцыю. Ужо заключаны дагавор з брэсцкай фірмай, якая будзе рабіць мастацкі праект экспазіцыі».

У будучыні плануюць інакш падаваць калекцыі. Тут думаюць адысці ад храналагічнага падыходу і стварыць кропкавую экспазіцыю. Усё будзе пачынацца з адной залы — а з яе наведвальнік зможа выбраць любы напрамак. І, гледзячы на тое, якая будзе абрана экскурсія, яе ўдзельнікаў накіруюць у адпаведны бок.

Імаверна, з'явіцца асобнае памяшканне для правядзення музейных заняткаў для школьнікаў — бо гэтая паслуга надзвычай папулярная.

Адкрыццё новай экспазіцыі можна чакаць мінімум праз 2-3 гады. Аднак работы плануюць праводзіць паступова, таму цалкам музей зачыняцца не будзе.

### З'ЯЎЛЕННЕ ГОРАДА...

«Адным з каштоўных экспанатаў з'яўляецца знак Лукіна, — распавядае Алена Бычко. — Гэты знак выдаваўся ў гады Першай сусветнай вайны ў гонар першага стрэлу па Басфоры. Такіх знакаў па ўсім свеце захавалася ўсяго чатыры. Адзін з іх — у баранавіцкім музеі. Гэта рарытэт, унікальны прадмет. Аднак, на жаль, невядома, каму ён належаў».

У гэтай жа зале апавядаецца пра тое, як з'явіўся горад Баранавічы. Частка экспазіцыі прысвечана гэтаму перыяду. Населены пункт узнік найперш як чыгуначная станцыя ў лістападзе 1871 года. І вось менавіта з маленечкай станцыі Маскоўска-Брэсцкай чыгункі (цяпер чыгуначны вакзал Баранавічы-Цэнтральныя) развілася спачатку мястэчка Баранавічы-Развадова, названае так у гонар свайго заснавальніка Івана Развадоўскага і яго сям'і. Потым, ужо пасля Першай сусветнай вайны, Баранавічы сталі горадам.

«Баранавічы адыгрывалі значную ролю ад самага пачатку заснавання станцыі, — тлумачыць музейшчыца. — Гэта быў даволі буйны чыгуначны пункт. Адсюль можна было даехаць у розныя бакі — і ў Брэст, і ў Маскву, і ў Вільню, і ў Коўна, і ў Беласток. У пачатку XX стагоддзя тут ужо пражывала каля 30 тысяч чалавек. Гэта было вельмі буйное мястэчка — па колькасці насельніцтва яно займала чацвёртае месца ў Мінскай губерні пасля Мінска, Бабруйска, Пінска. Але ўсё-такі гэта было толькі мястэчка. Перад пачаткам Першай сусветнай вайны рабіліся спробы перавесці яго ў лік гарадоў. Спачатку казалі, што не ўсе дакументы сабраныя. А пасля пачалася вайна. Тут ужо было не да папяровых спраў».

У гады Першай сусветнай вайны Баранавічы адыгралі даволі важную ролю. У першы год вайны, з 1914-га да 1915-га, тут размяшчалася стаўка вярхоўнага галоўнакамандуючага беларускай арміі. Сюды дзесяць разоў прыязджаў цар Мікалай II. Пасля таго як у 1915 годзе тут усталявалася германская акупацыя, у тым жа будынку, дзе сёння знаходзіцца краязнаўчы музей, размясціўся штаб германскай арміі. Сюды таксама прыязджала камандаванне, у тым ліку апошні кайзер Вільгельм II. То-бок і для аднаго, і для другога варожага боку Баранавічы адыгралі даволі значную ролю. Толькі ў пачатку 1919 года скончылася германская акупацыя — пасля гэтага амаль адразу, у лютым 1919 года, Баранавічы нарэшце атрымалі статус горада.

Мірнае жыццё працягвалася не так доўга. У 1919—1920 гадах была савецка-польская вайна. Горад дзесяць разоў пераходзіў ад аднаго боку да іншага. І толькі ў 1921 годзе нарэшце атрымаў нейкую стабільнасць — увайшоў у склад Польшчы. З 1921-га да 1939-га ён з'яўляўся горадам Другой Рэчы Паспалітай. Тут будаваліся розныя рэлігійныя ўстановы, была ўзведзена «чыноўніцкая калонія», размяшчаліся памяшканні для работы. Дарэчы, пабудовы, якія захаваліся з таго часу да нашых дзён, на сённяшні дзень з'яўляюцца помнікамі архітэктуры.

### БУДЫНКІ З «ЧЫНОЎНІЦКАЙ КАЛОНІІ»

Сённяшняя вуліца Савецкая (участак ад моста да плошчы Леніна — былая вуліца Марынская) захоўвае некалькі будынкаў пачатку XX стагоддзя. У адным з іх, былым доме Брэгмана (вядомага гандляра), калісьці знаходзілася яго крама, а сёння — акурат краязнаўчы музей. У доме насупраць — рэстаран. Захаваўся колішні кінатэатр «Эдэм». Сучасны бар «Правінцыя» размяшчаецца ў будынку пачатку XX стагоддзя. Будынак каледжа лёгкай прамысловасці — таксама таго ж часу, але мае перабудаваны выгляд. Гарадская друкарня стаіць на тым месцы, дзе размяшчаўся дом Шлайнера, які быў вядомым уладальнікам ткацкай фабрыкі, а таксама стварыў дабрачыннае пажарнае таварыства.

У нядаўна адрамантаваным старым будынку размясціліся крама «Тры цаны» і піцэрыя «Дамінас». У даўнія часы ў ім таксама была кавярня.

«Даволі шмат пабудоў 20—30-х гадоў XX стагоддзя ёсць у цэнтры горада — вакол плошчы Леніна і вуліцы Леніна, — кажа Алена Бычко. — Гэта будынкі з той самай «чыноўніцкай калоніі». Там сяліліся людзі, якія працавалі ў банках, на пошце, — займалі важныя на той час месцы. Для іх будавалі тыпавыя двухпавярховыя дамы. У адным з іх цяпер знаходзіцца рэдакцыя газеты «Наш край». У іншым — кавярня «Джазавая кава». Яшчэ ў адным, па бульвары Хейнала, — дзіцячы садок».

Варта згадаць і пра пажарную каланчу — у сучасным горадзе яна месціцца каля вакзала Баранавічы-Палескія. Там жа, каля вакзала, ёсць некалькі будынкаў пачатку XX стагоддзя — адзін з іх пустуе, а другі выкуплены літаральна месяц таму. Што ў ім будзе, пакажа час.



У горадзе працуе чыгуначны музей — іх усяго два ў Беларусі, яшчэ адзін знаходзіцца ў Брэсце, крыху большы памерам. Ёсць у Баранавічах і дзве рэлігійныя пабудовы 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Гэта Крыжаўзвіжанскі касцёл па вуліцы Куйбышава, а таксама Свята-Пакроўскі сабор па той жа вуліцы. У апошнім варта звярнуць увагу на ўнікальныя мазаікі, створаныя ў майстэрні Фралова.

«Усё астатняе ў горадзе будавалася пасля заканчэння Другой сусветнай вайны — камусьці таксама здасца цікавым, а ў іншых не выкліча інтарэсу», — рэзюмуе спецыяліст.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота аўтара.**
*г. Баранавічы.*

Пантэон Айчыны

# Сімяон Полацкі *(1629—1680)*

**Свайго настаўніка Сімяона Полацкага ягоны вучань Сільвестр Мядзведзеў назваў настаўнікам «роду российску», які прыехаў у Маскву «в научение роду российску». Сапраўды, дзейнасць Сімяона Полацкага — гэта цэлая эпоха ў рускай культуры, што дала імклівы імпульс для яе развіцця. Але ён і гонар беларускай культуры, бо ягоны талент сфарміраваўся на яе ўрадлівай ніве.**

Юнак з Полацка (яго сапраўднае поўнае імя Самуіл Гаўрылавіч Пятроўскі-Сітняновіч) атрымаў выдатную адукацыю ў Кіева-Магілянскай акадэміі і Віленскай езуіцкай акадэміі. Дзіўным чынам у ім спалучаліся заходнееўрапейскія культурныя дасягненні з візантыйска-рускімі традыцыямі — новае са старым. І ён у сваіх смелых пераўтварэннях усё ж не выходзіў за межы традыцыйнага. Хоць, з іншага боку, лёс Сімяона Полацкага — гэта яскравы прыклад лёсу тагачаснай творчай асобы, чый талент эксплуатавалі царква і ўлада, для якіх ён быў толькі рамеснік для паслуг. Ды і час для творчасці быў для Сімяона неспрыяльны — крывавыя войны сярэдзіны XVII стагоддзя зруйнавалі і яго родную Полаччыну, і саму Рэч Паспалітую. Патрэбны былі воіны, а не вучоныя юнакі. Сімяон з горкай іроніяй насміхаецца з сябе:

Ума излишком, аж негде девати, —
Купи, кто хощет, а я рад продати...

Так і не знайшоўшы, каму прадаць «ума излишки», ён пайшоў у Полацкі Богаяўленскі манастыр і пастрыгся пад імем Сімяон. Пэўна, на гэта паўплывала і сардэчная траўма ад няшчаснага кахання. У адным са сваіх вершаў ён наўпрост указвае, што «злые люде женится не дали».

Сімяон выбраў свой шлях. Выкладаў у брацкай школе. У часы смутку і скрухі ён ратаваўся стварэннем вершаў-маленняў, у якіх прасіў Бога даць яму духоўных сіл. Цяжка быць адначасова паэтам з лірычнай душой і манахам, абмежаваным суровай аскезай.

Нарэшце, з'явіўся той, каму можна было прадаць «ума излишки», — рускі цар Аляксей Міхайлавіч, які ў ліпені 1656 года прыбыў у Полацк. На замову манаскай брацііі Сімяон напісаў урачыстыя віншаванні цару — «Метры». Вучні брацкай школы ўзвышана віталі вершамі Сімяона цара — «пресветлого», «благочестивого», «христолюбивого», «проведное солнце». Праўда, Сімяон, відаць, пісаў «Метры» без усялякага натхнення, а дакладней, спісаў іх з твора XVI стагоддзя «Прасфоніма» — такім вось чынам і паказаў сваё стаўленне. Не магло яго кранунць адкрытае рабаванне, учыненае царом, які забраў з Полацка абраз Божай маці Эфескай — святыню ўсёй Полацкай зямлі. Сімяон шчыра аплакваў страту святыні і прасіў у сваіх вершаваных радках святую Ефрасінню маліць Бога аб вяртанні абраза. Як бачым, не толькі прозвішча звязвала яго з радзімай, але і глыбокі смутак аб яе лёсе. І ўсё ж у 1664 годзе ён пакінуў родны Полацк з-за цкаванняў манаскага начальства.

Цар даручыў вучонаму манаху з Полацка выхаванне царэвічаў Аляксея і Фёдара. Сімяон раскрыў іх схаваныя таленты: Аляксей рабіў поспехі ў вывучэнні лаціны, а малодшы Фёдар захапіўся паэзіяй і складаў добрыя вершы. Але сваю галоўную задачу Сімяон бачыў у выхаванні ў царэвічаў гуманных пачуццяў, любові да сваіх падданых. Ён складае вершы пра тое, якой мусіць быць улада, — «христолюбивой», «добродетельной», кіравацца разумнымі парадамі, захоўваць праўду. Нават самога цара манах павучае захоўваць маральныя прынцыпы ў кіраванні дзяржавай і ў асабістым жыцці, захоўваць сваіх «авечак» і абараняць іх ад «ваўкоў». Маскоўскае праваслаўнае святарства глядзела на яго з апаскай і недаверам, як на «лацініка», які прыехаў у Маскву пашыраць «лацінскую ерась». Сімяон сутыкнуўся з неразуменнем яго шчырых памкненняў несці асвету. Святары і прыхаджане не ўспрымалі яго казанні «за высоту словес». Заклікі да цара засноўваць школы былі пустымі. Голас Полацкага гучаў у пустэчы. Аднак ён карыстаўся любой падставай данесці свае слова да царскага слыху, хай нават у вітальных усхваленнях. Штодня Сімяон пісаў па некалькі старонак дробным почыркам, пісанне для яго зрабілася духоўнай патрэбай. Падлічана, што ён пакінуў пасля сябе каля пяцідзесяці тысяч вершаваных радкоў. Уражвае! Але такая плённасць не спрыяла высокаму мастацкаму ўзроўню яго твораў. Хоць для таго часу яны былі шэдэўрамі — так, даследчык Алена Яскевіч вельмі высока ставіць «камедыю» Полацкага пра блуднага сына і лічыць яе вяршыняй сімвалізму еўрапейскага барока.



Муза так і не натхніла Сімяона Полацкага на вечны паэтычны шэдэўр, аднак менавіта ён, натхнёны ёй, пасадзіў у глебу рускай культуры дрэва паэзіі, якое пазней узрасце і яскрава расквітнее.

Пад апекай свайго выхаванца цара Фёдара Аляксеевіча Сімяон Полацкі змог ажыццявіць даволі шмат. У заснаванай Сімяонам друкарні выходзілі яго кнігі: «Букварь языка словенска», напісаны ім для царэвіча Пятра Аляксеевіча, «Псалтырь рифмотворная» — паэтычны пераклад псалмоў, які вялікі Міхаіл Ламаносаў назваў «брамай сваёй вучонасці». Да друку былі падрыхтаваны ёмістыя паэтычныя зборнікі «Ветроград многоцветный» — своеасаблівая вершаваная энцыклапедыя аб гістарычных, біблейскіх, міфалагічных героях і падзеях, аб розных з'явах і жывёлах. Адначасова з кнігадрукарскай справай Сімяон распрацоўвае праект стварэння і статут першай у Масковіі вышэйшай навучальнай установы — Грэка-лацінскай акадэміі. Можна дзівіцца ўсеабдымнасці Полацкага, які імкнуўся ахапіць сваім словам усе праявы духоўнага жыцця грамадства і самога чалавека: філасофію, літаратуру, навуку, тэатр, іканапіс, музыку, асвету, дзе ён пакінуў свой добры дарobак. Яго постаць ужо тады была велічная, пра вучонага манаха і яго творчасць пісалі оксфардскі лінгвіст Лудольф, аўтар «Сказания аб Московии» Якуб Рэйтэнфельс, якія бачылі ў асобе Сімяона Полацка яскравую праяву еўрапейскай культуры і «лацінскай вучонасці» ў далёкай і загадкавай Масковіі.

Пасля смерці Сімяона Полацкага 25 жніўня 1680 года яго вучань Сільвестр Мядзведзеў выдаў «Ветроград» і два зборніка казанняў «Обед душевный» і «Вечеря душевная». Праз кнігі слова Полацкага прыйшло да людзей. Яно мусіла паслужыць выпраўленню чалавечых заган, «врачеванию недугов». Праваслаўныя святары, ратуючы сваё «невуцтва», прызналі яго слова ерэтычным. Сам ён быў абняслаўлены і зганьбаваны. Але слова было вымаўлена, і яго пачулі. Выхаванец Сімяона цар Пётр пачаў у Масковіі маштабныя пераўтварэнні, далучаючы яе да Еўропы.

Сімяон Полацкі хацеў, каб чалавек быў «Богу точный» і «совершенный», прыгатаваў для яго духоўную трапезу «от слова Божия». А сам як вучыў, гэтак і пражыў «проповедию слова народу полезный».

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

Сваімі словамі

# ВЕЧНА ТВАЁ

**102 гады «Звяздзе»! Святкавалі ўсе разам у мінулую пятніцу. Урачыста ўпрыгожылі фае. Сёе-тое падрыхтавалі з прысмакаў. Зладзілі «Газетныя гульні» — па аналогіі з фільмам «Галодныя гульні». Праўда, у нас ніхто нікога не забіваў і людзі адно на аднаго не палявалі. Наадварот, сваю вікторыю аддавалі іншаму, дзесьці вырашалі, што перамагло сяброўства — як і заўсёды ў «Звяздзе»!**




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

З гэтых 102 гадоў сем з паловай — мае. Час станаўлення як журналіста, час сталення. Спадзяюся, што за тое, што з мяне атрымалася, калегам не сорамна! Усміхаюся і радуюся іх кампліментам.

Што ж было за гэту больш чым векавую гісторыю найстарэйшай беларускамоўнай газеты? Для многіх такая лічба гучыць вельмі і вельмі паважна. Але за любой лічбай, за прыгожай падзеяй стаяць канкрэтныя асобы. Не заўсёды іх імёны ўпісаны ў гісторыю. Часта многіх насамрэч вартых памяці людзей усё-такі забываюць. Аднак нічым не сцерці іх справы. Ніякім каркэтарам не замазаць і лязом з асабістай справы не выскрабці тое, што паспеў зрабіць чалавек. Нават калі гэта і не занатуюць летапісцы, яно застаецца.

Хтосьці выдаваў «Звязду» ў часы вайны: у зямлянках, на востраве, у падпольных кватэрах. Сёння гэтыя імёны мы ведаем як імёны герояў. Аднак і тое, што робіцца ў мірны час, мае не меншую каштоўнасць. Пісаць якасныя артыкулы, думаючы пра свайго чытача. Распрацоўваць праблемныя тэмы, імкнучыся некаму дапамагчы. Рабіць інтэрв'ю з цікавымі героямі — каб больш людзей даведалася пра іх карысныя ініцыятывы і каб іх уласнае меркаванне пра сябе крыху палепшылася. І калі іншы журналіст ці фотакар дазваляе сабе слабіну, ты зноў згадваеш твары тых чытачоў, якіх ведаеш асабіста, — нібы яны, прысутныя тут, зараз глядзяць менавіта на цябе. Таму даводзіцца трымаць планку, уздымаць яе яшчэ вышэй. І дзесьці на нябачных вагах узважваецца тое, што ўнёс кожны ў 102-гадовую гісторыю газеты.

Для тых людзей, якія працуюць з табой кожны дзень, пад бокам, каштоўнасці і шкала вымярэння крыху іншыя. Усё вымяраецца яшчэ і колькасцю праведзеных разам абедаў, выпітай сумесна кавай і гарбатай за добрымі размовамі, печывам, прынесеным з дому, каб пачаставаць любімых калег. Вядомы факт, што для тых, хто працуе побач, важна не тое, што мы робім, а тое, якія мы ёсць. Наколькі з намі прыемна, добра. Наколькі проста!

Пра ўсё, што я напісала вышэй, хтосьці скажа, што такое магчыма толькі ў ідэальным свеце! Не заўсёды ў рэальнасці навокал спрыяльныя ўмовы: матэрыяльнага стымулявання хацелася б больш, не надта зручна з кімсьці ісці на гарбату — работу ж, вечную сваю работу трэба дарабіць. Але класік наш, Уладзімір Караткевіч, з гэтай нагоды праз дзесяцігоддзі прамаўляе: «Але вечна тваім застанецца толькі тое, што ты аддаў». Не заўсёды гэта зручна, проста, і нават не заўсёды хочацца. Але такія яны, каштоўнасці вечнасці: аддаваць, дбаючы найперш пра іншага, а пра сябе — у другую ці трэцюю чаргу.

Для мяне гэты палёт у космасе «Звязды» быў прыемным. Любімая тэма гісторыка-культурнай спадчыны. З радасцю арганізаваныя многія рэдакцыйныя святы. І ўсё тыя ж прыемныя паходы на абед і проста цёплыя размовы з добрымі калегамі. Дзякуй за нашу сумесную гісторыю! Нават тое, што не запісана, запомніцца.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

Радзімазнаўства

# Гродна: «Аб градзе гэтым і ўсіх, хто вераю жыве ў ім»

**Фотаальбом «Каложская царква» гродзенскага фотамайстра Аляксандра Ласмінскага выдадзены ў пярэдадзень Дня беларускага пісьменства ў Слоніме. Увогуле, на Гродзеншчыне актыўна развіваецца краязнаўчы рух у розных праявах. І візуалізацыя аб'ектаў даўніны — адзін з кірункаў у гэтай справе.**

З прадмовай да сімпатычнай і красамоўнай праз выдатныя фотаздымкі фотакнігі, «зялёнае святло» якой дало выдавецтва «Беларусь», выступае архіепіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі Арцемій. Вось што, у прыватнасці, ён зазначае: «Акрамя гісторыка-культурнай каштоўнасці для горада Гродна, Свята-Барыса-Глебскі храм на Каложы мае яшчэ і вялікае духоўнае значэнне. Па-першае, гэты адзіны з храмаў, што захаваўся з XII стагоддзя, выразна сведчыць пра тое, што менавіта ўсходняя хрысціянская традыцыя, якая атрымала пасля назву праваслаўнай, была першаснай у Гродне — горадзе, які ў перыяд Сярэднявечча быў сапраўдным фарпостам на заходніх межах Старажытнай Русі. Па-другое, той факт, што храм быў асвячоны ў гонар святых дабраверных князёў і пакутнікаў Барыса і Глеба, сыноў святога роўнаапостальнага вялікага князя Уладзіміра — хрысціцеля Русі, кажа пра асаблівую духоўную і культурную супольнасць усходніх славян — продкаў сучасных беларусаў, рускіх і ўкраінцаў — і дае нам выдатны пыркл ад іх адзінства ў Хрысце, у якім, па словах апостала Паўла, «няма ні эліна, ні іўдзея... але ўсё і ва ўсім Хрыстос». І, па-трэцяе, старажытная Каложская царква справядліва лічыцца сярод жыхароў Гродна адным з самых святых месцаў у горадзе. Бо тут, у сценах старажытнага храма, з XII стагоддзя ўзносіцца малітва «аб богаахаванай нашай краіне», «аб градзе гэтым і ўсіх, хто вераю жыве ў ім». Пад гэтыя старажытныя скляпенні прыходзяць людзі рознага ўзросту і сацыяльнага статусу па малітвеную дапамогу да святых Барыса і Глеба, пад жыватворнае Пакрывa Маці Божай дзеля цудатворнай іконы «Каложскай». Многія менавіта тут імкнуцца атрымаць благаславенне Божае на ўступленне ў шлюб і далейшае сумеснае сямейнае жыццё, а затым прыносяць сваіх дзяцей, каб спадобіць іх благадаці Святога Хрышчэння».

«Несмяротным тварэннем нашых продкаў» называе Аляксандр Ласмінскі Каложскую царкву. А сваім фотапаглядам унікліва сягае ў сэрца і душу Каложы, паказвае яе палёт і яе ўзвышанасць у гарадскім інтэр'еры, у сённяшнім дні старажытнага горада. Поруч з арыгінальнымі здымкамі сапраўднага майстра — рэпрадукцыі старых паштовак з выявай Каложскай царквы ў пачатку XX стагоддзя, выявы варыянта рэканструкцыі Каложскай царквы М. Вароніна (1954 год), абмерная чарцяжа перыметра храма. На здымках Аляксандра Ласмінскага — дэталі, фрагменты каложскіх артэфактаў, літаральна ўсе куточкі царквы.

Тыраж выдання — 2000 экзэмпляраў. Няма ніякіх сумненняў, што фотакніга Аляксандра Ласмінскага шырока разыдзецца не толькі па Гродзеншчыне, але і па ўсёй нашай краіне. Варта адзначыць, што Аляксандр Ласмінскі — знаны фоталетапісец Гродзеншчыны. Дзякуючы яго творчай руплівасці пабачылі свет фотальбомы «Аўгустоўскі канал», «Прынёманне. Гродзенская вобласць», «Возера Свіцязь», «Гродзенская зямля з вышыні птушынага палёту». У 2011 годзе Аляксандра Ласмінскага ўзнагародзілі медалём Францыска Скарыны.

**Сяргей ШЫЧКО.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор электронных торгов (продавец):** Унитарное предприятие «Клецкий производственно-пищевой завод», 222531, Минская область, Клецкий район, г. Клецк, ул. Кирова, д. 1, +375 33 335 67 19.

**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Торги проводятся 16.09.2019 г.** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», www.et.butb.by. **Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

| № лота | Наименование предмета торгов; его местонахождение | Краткая характеристика | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел.руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | здание колбасного цеха с оборудование; Минская область, г. Клецк, ул. Кирова, 1 | фундамент бетонный, внутренние капитальные стены кирпичные, перекрытие междуэтажные ж/б, перекрытие подвальные ж/б, крыша совмещенная, полы бетонные, плиточные, окна ПВХ, проемы дверные дощатые | 821 299,54 | 82 129,00 |

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами –** 10.09.2019 г. до 15.00.

**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка –** не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка для участия в электронных торгах, рег. № ___ по заявлению № ___.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

Победитель (единственный участник) торгов в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах торгов обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, иные платежи, указанные в протоколе.

Срок подписания договора купли-продажи недвижимого имущества и аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат, иных платежей, указанных в протоколе о результатах торгов.

**ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод»**

сообщает, что электронные торги по продаже недвижимого имущества (расположенного по адресу: Могилевская область, Кричевский район, Лобковичский с/с, 4/1, 0,3 км западнее г. Кричева) **состоится 13.09.2019 года.** Информацию об условиях проведения электронных торгов можно уточнить на сайтах torgi.gov.by и bankrot.gov.by.

УНП 700103211

**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланк квитанции и бланки страховых полисов:

- квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ № 4463373;
- полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№ 1791423, 1791438, 1791450, 1784283, 1782457, 1684345, 1794680, 1786352.

УНП 100782388

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ООО «БЕЛМЕТАЛЛ»** (УНП 100055010) 220075, г. Минск, пр-т Партизанский, 174, к. 301, тел./факс: +375 (17) 344-87-71.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **28 августа 2019 г.** 09.00-17.00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. с НДС | Местонахождение |
|---|---|---|---|
| 1 | Грузовой самосвал «MAZ 555102 225», 2006 г. в. | 7 200,00 | г. Минск, пр-т Партизанский, 174 |
| 2 | Прицеп бортовой «MAZ 837810 042», 2010 г. в. | 5 640,00 | |
| 3 | Полуприцеп МТМ-93304, 1998 г. в. | 2 640,00 | г. Гродно, пер. Победы, 5 |
| 4 | Автопогрузчик 40814, 1992 г. в. | 4 200,00 | |
| 5 | Кран автомобильный КС4561АМ (на шасси КрАЗ-250), 1989 г. в. | 7 800,00 | |
| 6 | Станок деревообрабатывающий БДК-202 | 35 064,00 | г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 18/В |
| 7 | Станок деревообрабатывающий | 252,00 | |
| 8 | Мотобур SHTILL BT 121C | 948,00 | |

### Телефон для ознакомления +37529 698-53-53

**Для участия в торгах необходимо в срок по 27.08.2019 г. 17.00** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY,** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, уплатить аукционный сбор, заключить договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 27.06.2019 г.

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

### «Строительство группы жилых домов (3-й пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение ул. Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой»

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме № 35 по генплану в Минском районе без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика.

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник-пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

**Сведения о жилых домах и иных объектах недвижимости, в строительстве которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих опубликованию проектной декларации**

В течение трех предшествующих лет ООО «СИ-трейдинг» как заказчиком строительства были построены следующие объекты, расположенные в д. Копище Минского района:

- жилой дом № 19/4 по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: июнь 2015 г. – март 2016 г.;
- жилой дом № 1 по ул. Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: сентябрь 2015 г. – июнь 2017 г.;
- жилой дом № 21Б по ул. Подгорная, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: июнь 2017 г. – октябрь 2018 г.;
- жилой дом № 5 по Николая Михайлашева, д. Копище Минского района, фактические сроки строительства: апрель 2018 г. – июнь 2019 г.

**Информация об объекте строительства:**

**цели строительства –** строительство жилого дома в составе объекта «Строительство группы жилых домов (3 пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение улицы Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой» в д. Копище Минского района.

**Сведения об этапах строительства и о сроках его реализации:**

начало строительства - май 2018 года;

окончание строительства – август 2020 года.

**Результаты государственной экспертизы проектной документации:**

положительное заключение государственной экспертизы от 23 марта 2018 г. № 241-70/18, выданное дочерним республиканским унитарным предприятием «Госстройэкспертиза по Минской области».

**Сведения о месте нахождения объекта строительства:**

местонахождение объекта строительства: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Боровлянский с/с, д. Копище; микрорайон № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района.

**Характеристика объекта строительства:**

проектной документацией предусматривается строительство жилого дома № 35 по генплану (далее – «жилой дом») в составе третьего пускового комплекса микрорайона № 1 Жилого района «Копище» по индивидуальному проекту.

В соответствии с определением, приведенном в Указе Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667, здание жилого дома относится к домам типовых потребительских качеств.

Жилой дом – здание 148-квартирного жилого дома, 25-этажное, односекционное с подвалом и техническим «теплым» чердаком. На первом этаже размещены встроенные помещения административного назначения с отдельными входами. В уровне подвала размещен встроенно-пристроенный гараж-стоянка на 46 машино-мест. Жилой дом расположен вдоль ул. Подгорная. Заезд к жилому дому осуществляется с ул. Лопатина. После завершения строительно-монтажных работ на прилегающей территории будет выполнено благоустройство и озеленение.

Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с частичным использованием в качестве несущих элементов кладочного заполнения стен. Фундаменты свайные с монолитными железобетонными ленточными и столбчатыми ростверками. Наружные и внутренние стены техподполья – монолитные железобетонные. Колонны – монолитные железобетонные. Наружные и внутренние несущие стены жилой части из керамических поризованных блоков. Перегородки из пазогребневых полнотелых керамзитобетонных блоков. Перекрытия и покрытие – монолитные железобетонные плиты. Утепление наружных стен предусмотрено легкой штукатурной системой с минераловатными плитами. Лестницы – монолитные железобетонные марши и площадки. Кровля жилого дома – малоуклонная с покрытием из двух слоев кровельного материала. Кровля гаража-стоянки – эксплуатируемая под озеленение и автомобильные нагрузки с покрытием из тротуарных плит. Здание оборудовано тремя лифтами. Внутренняя отделка мест общего пользования предусмотрена с окраской стен, устройством плиточных полов и подвесных потолков.

В жилом доме предусмотрены поквартирные системы отопления с устройством индивидуальных узлов учета тепла. В качестве нагревательных приборов приняты радиаторы панельные. Вентиляция жилых помещений естественная. Вентиляция помещений кухонь, ванных и санузлов осуществляется через унифицированные вентблоки. Вентиляция гаража-стоянки – приточно-вытяжная с механическим побуждением. Здание оборудовано раздельными системами хоз.-питьевого и противопожарного водоснабжения. В здании предусмотрена система дымоудаления из внеквартирных коридоров, система подпора воздуха в шахты лифтов. В жилых комнатах предусмотрена установка автономных пожарных извещателей.

Электроснабжение осуществляется путем поквартирной разводки электропроводки. Учет потребляемой электроэнергии осуществляется электросчетчиками, установленными для каждой квартиры в этажных щитах. Предусмотрена автоматизированная система контроля и учета электроэнергии (АСКУЭ).

Для телефонизации жилого дома предусмотрено построение пассивной оптической системы (PON), обеспечивающей возможность подключения телефонных аппаратов, высокоскоростного интернета, цифрового телевидения. Для обеспечения содержания входной двери в подъезд закрытой на замок, двухсторонней связи с жильцами и дистанционной разблокировки из квартир входной двери используются видеодомофоны.

Технико-экономические показатели жилого дома: количество жилых этажей – 25; количество секций – 1; количество квартир – 148, в том числе однокомнатных – 51 (общей площадью от 38,17 до 41,63 кв. м), двухкомнатных – 72 (общей площадью от 56,71 до 61,68 кв. м), трехкомнатных – 25 (общей площадью 71,24 и 73,15 кв. м). Общая площадь квартир – 7977,07 кв. м.

**Строительная готовность жилых помещений:**

- частичная внутренняя отделка: штукатурка стен и перегородок, стяжка пола, монолитные железобетонные потолки;
- вентиляция – естественная по схеме: приток через окна, вытяжка через каналы унифицированных вентблоков;
- электроснабжение – поквартирная черновая разводка электропроводки с установкой розеток, выключателей, звонка, электросчетчика, без установки электроплиты;
- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета, полотенцесушитель;
- канализация – стояк, установка и подключение унитаза;
- отопление водяное – скрытая в полу разводка, отопительные приборы (радиаторы, конвекторы);
- окна и двери на лоджии – из ПВХ профиля со стеклопакетом;
- остекление лоджий – из ПВХ профиля со стеклопакетом;
- телефонизация, телефикация, интернет – ввод сетевого кабеля в квартиру, оптическая розетка;
- видеодомофон;
- дверь входная деревянная;
- пожарный шланг;
- автономный пожарный извещатель.

**Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика (на дату опубликования проектной документации):**

- 10 (десять) 1-комнатных квартир общей площадью по проекту от 38,17 до 41,63 кв. м. Стоимость за 1 (один) кв. м общей площади квартиры – 2 500 (две тысячи пятьсот) белорусских рублей при 100% оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период по графику платежей – 2 600 (две тысячи шестьсот) белорусских рублей.

Условия заключения договоров создания объекта долевого строительства:

1. При заключении договора участник долевого строительства вправе выбрать квартиру соответствующей площади из имеющихся свободных квартир, предложенных застройщиком для заключения договоров на момент заключения договора создания объекта долевого строительства.

2. Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях, перечисляется дольщиком на специальный и расчетный счет застройщика в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договоров создания объекта долевого строительства осуществляются, начиная с первого рабочего дня, следующего за днем опубликования настоящей декларации, в порядке живой очереди по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Со дня начала заключения договоров создания объекта долевого строительства прием и регистрация заявлений на заключение договоров осуществляется при заключении договоров. Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ООО «СИ-трейдинг» вправе заключить договор с другим претендентом.

Условия возможного изменения цены застройщиком в одностороннем порядке: застройщик вправе изменить цену договора (цену объекта долевого строительства) в случаях изменения прогнозных индексов цен в строительстве в нормативный срок строительства объекта строительства и дополнительный срок строительства при продлении нормативного срока строительства в установленном законодательством порядке в случае отсутствия вины застройщика, а также изменения законодательства об уплате косвенных налогов в указанные сроки, если они оказали влияние на цену договора (цену объекта долевого строительства).

В возводимом жилом доме отсутствуют жилые помещения, при заключении договоров по которым должно отдаваться предпочтение гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.

**Данные о вещном праве на земельный участок, предоставленном застройщику для строительства объекта долевого строительства, его границах и площади, элементах благоустройства:**

Земельные участки находятся в постоянном пользовании ООО «СИ-трейдинг» с целевым назначением для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой, смотровых колодцев и инженерных сетей по объекту «Строительство группы жилых домов (3-й пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение улицы Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой». Свидетельство (удостоверение) № № 600/1072-14293, 600/1072-14292, 600/1072-14291, 600/1072-14290, 600/1072-14289 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на земельный участок (право постоянного пользования) с кадастровым номером 623680604101000376 площадью 0,5308 га, с кадастровым номером 623680604101000375 площадью 0,0001 га, с кадастровым номером 623680604101000374 площадью 0,0001 га, с кадастровым номером 623680604101000373 площадью 0,0001 га, с кадастровым номером 623680604101000372 площадью 0,0001 га, расположенные по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Копище, составленные РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру 24 мая 2019 года.

Проектом предусмотрено благоустройство придомовой территории, включая строительство площадок для парковки легкового автомобильного транспорта, тротуаров, пешеходных дорожек, площадки для игр детей, сбора твердых бытовых отходов.

**Функциональное назначение нежилых помещений в жилом доме, не входящих в состав общего имущества:** два встроенных помещения административного назначения с отдельными входами на первом этаже, машино-места в подземном гараже-стоянке, объекты магистральной и распределительной инженерной инфраструктуры, финансируемые при строительстве объекта, которые будут переданы эксплуатирующим их организациям в установленном законодательством порядке.

**Общее имущество жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию данного дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам:** в состав общего имущества совместного домовладения, поступающего в общую долевую собственность всех дольщиков, входят помещения инженерного назначения (электрощитовая, тепловой пункт, лифтовые шахты, водомерный узел, насосная), коридоры общего пользования, кладовые для уборочного инвентаря, лифты, лестнично-лифтовые холлы, межэтажные лестницы, тамбуры, конструкции водоотводящие устройства, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилого дома, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства (площадки для раздельного сбора бытовых отходов, уличные парковочные места, проезды, тротуары, детская площадка), а также внутриплощадочные и внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения жилого дома. Конкретный перечень имущества, входящего в состав общего имущества совместного домовладения, определяется застройщиком по итогам технической инвентаризации многоквартирного жилого дома и передаются застройщиком по акту приемки-передачи представителю товарищества собственников, если на момент ввода в эксплуатацию это товарищество создано. Если такое товарищество не создано – лицу, определяемому общим собранием дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

**Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию многоквартирного жилого дома:** август 2020 года.

**Сведения о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком:** договор строительного подряда № 22/05-2018 от 22.05.2018 г., заключенный застройщиком со Строительным унитарным предприятием «СИ-трейдинг-Строй».

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by.

Срок действия настоящей декларации – до опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие либо изменяет опубликованной ранее

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: Унитарное предприятие «Строительно-монтажное управление «ПОДЪЕМ» (УНП 192522108) в лице ликвидатора Региса Алексея Альбертовича, +37529 378-83-88.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **«26» августа 2019 г.** 09:00-17:00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Инв. № | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | 44072 | Зигмашина И-2714 | 499,20 |
| 2 | 44201 | Кран мостовой г/п 5+5mc | 5 712,00 |
| 3 | 44204 | Кран мостовой г/п 5+5mc | 5 712,00 |
| 4 | 44205 | Кран мостовой г/п 5+5mc | 5 712,00 |
| 5 | 44216 | Лебедка ЛМ-2 | 633,60 |
| 6 | 44224 | Лебедка электрическая 5тн. | 1 324,80 |
| 7 | 47841 | Полуавтомат POWERTEC -500S PRO WATER | 1 257,60 |
| 8 | 44144 | Пресножницы Нв-5221 | 1 603,20 |
| 9 | 44132 | Пресс К2320 | 748,80 |
| 10 | 44106 | Пресс-ножницы с-229а | 336,00 |
| 11 | 47864 | Принтер EPSON Stylus Pro 7700 | 1 660,80 |
| 12 | 44049 | Станок вертикально-сверлильный 2Н135 | 873,60 |
| 13 | 44057 | Станок торцефрезерный ТФС-4 | 7 468,80 |
| 14 | 44067 | Станок точильно-шлиф.3Б632 | 604,80 |
| 15 | 44151 | Станок фальцепрокатный СТД-16А | 1 334,40 |
| 16 | 47892 | Автоматический воздушный компрессор (НТА-120) | 2 054,40 |
| 17 | 572 | Бытовка для рабочих б/у | 2 121,60 |
| 18 | 210103 | Вагон-бытовка | 652,80 |
| 19 | 100406 | Вагон-домик | 595,20 |
| 20 | 141621 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 182,40 |
| 21 | 141615 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 182,40 |
| 22 | 141623 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 182,40 |
| 23 | 141624 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 182,40 |
| 24 | 141617 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 182,40 |
| 25 | 141625 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРСШ 5,0/6,0 | 182,40 |
| 26 | 160603 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 182,40 |
| 27 | 141601 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 182,40 |
| 28 | 141609 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 182,40 |
| 29 | 141607 | Таль ручная шестеренная стационарная ТРШС 5,0/6,0 | 182,40 |
| 30 | 4020502 | Электростанция ENDRESS ESE 504 DHS (5кВт) бенз. | 873,60 |
| 31 | 66 | Станок заточный | 604,80 |
| 32 | 180 | Гибкий эндоскоп ЭТГ 10-1.5 | 1 267,20 |
| 33 | 185 | Ультразвуковой толщиномер БУЛАТ-1S | 432,00 |
| 34 | 4222 | Кран-балка | 2 851,20 |
| 35 | 573 | Приемник П-900 | 566,40 |
| 36 | 147510 | Электронный теодолит АНТОК | 480,00 |
| 37 | 456 | Станок 16к25 | 3 542,40 |
| 38 | 600147895 | Штангель-циркуль ШЦ-3-2000-0,1 | 748,80 |
| 39 | 410147866 | Машина для обработки кромок ВМ-20 | 729,60 |
| 40 | - | Погрузчик ДЗ-133 на базе трактора МТЗ 82.1, 2002 г.в., заводской №4173 | 10 152,00 |

Местонахождение – п. 1, 5, 6, 8-10, 12-17 – г. Бешенковичи, п. 2-4 – г. Заславль, п. 18,19 – г. Слуцк, п. 7, 11, 20-39 – г. Минск, ул. Вильямса 37а, п. 40 – Узденский р-н, аг. Слобода, телефон для ознакомления и осмотра +375 29 698-53-18.

**Для участия в торгах необходимо в срок по 23.08.2019 г. 17.00:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого, между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 15.05.2019 г., 27.07.2019 г.

# КАЛІ СТАРАСЦЬ ПЕРАСТАЕ БЫЦЬ МУДРАЙ...

**У свеце расце колькасць псіхічных праблем, звязаных з узростам**

**Апошнім часам у навінах нярэдка можна пачуць пра тое, што прапаў пажылы чалавек. «Заблудзіўся ў лесе», «забыўся дарогу дадому», «можа пакутаваць на страту памяці». Гэта далёка не адзінкавыя выпадкі. І датычацца яны не толькі нашай краіны.**

**На жаль, свет пачынаюць захлістваць праблемы, якіх ён раней не ведаў. Па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, цяпер больш за 47 мільёнаў жыхароў Зямлі хворыя на дэменцыю, і штогод гэтае войска папаўняецца на 10 мільёнаў чалавек. Па прагнозах медыкаў, да 2050 года іх колькасць патроіцца.**

**Пра тое, што гэта за захворванне і чаму пры ім пакутуе ўся сям'я, нам расказала псіхіятр-нарколаг, намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя-наркалогія» Кацярына КАТАРГІНА.**

## Што гэта такое?

Дэменцыя — гэта захворванне, асноўнай прыкметай якога з'яўляецца тое, што чалавек становіцца не ў стане сам сябе абслугоўваць. У яго зніжаецца інтэлект, ён не можа жыць адзін і мае патрэбу ў пастаянным доглядзе. Такіх людзей трэба ўвесь час кантраляваць, таму што яны могуць забыцца выключыць кран або газавую пліту, згубіцца ў звыклым месцы...

Узнікае захворванне найчасцей пасля 70 гадоў. І чым старэйшы ўзрост, тым больш рэгіструецца захварэлых. Развіваецца яно паступова. Першыя прыкметы часта ўкладваюцца ў карціну ўзроставых змяненняў. У чалавека пачынае зніжацца памяць, ён губляецца ў новай сітуацыі, па некалькі разоў перапытвае адно і тое ж і г. д.

Гэта неспецыфічныя парушэнні. У сталым узросце яны магчымыя і самі па сабе. Таму на першай стадыі вельмі мала людзей звяртаюцца па дапамогу — усё спісваецца на ўзрост. Звяртаюцца, прычым не самі пацыенты, а часцей за ўсё іх сваякі, да ўрачоў пачынаюць ісці пазней — калі гэтыя парушэнні становяцца вельмі прыкметныя.

Наогул, дэменцыя — гэта класічнае ўзроставае захворванне. Мозг, як і любы орган, паступова зношваецца і атрафіруецца, страчваецца крытычнасць успрымання... Калі б мы не паміралі ад іншых хвароб, то кожны з нас памёр бы ў рэшце рэшт ад дэменцыі. Гэта сумна. Але, з іншага боку, падумайце, як страшна паміраць у здаровым розуме і яснай памяці. І значна лягчэй — у стане, калі мы гэтага не ўсведамляем. Магчыма, прырода прыдумала гэта як спосаб аблегчыць наш сыход з жыцця: чалавек памірае, знаходзячыся пры гэтым у свеце сваіх ілюзій. Зрэшты, гэта толькі адна з гіпотэз.

## Бываюць розныя варыянты

Дэменцыя бывае рознай. Напрыклад, яна ўзнікае пры хваробе Альцгеймера, — тады ўсё адбываецца паступова. Ёсць і вострая дэменцыя, якая, дарэчы, можа паўстаць у любым узросце, нават у маладых людзей. Напрыклад, пасля шырокага інсульту, калі «выключана» і памерла вялікая частка мозга. Ёсць і спадчынныя выпадкі, якія таксама пачынаюцца ў маладым узросце, дзесьці пасля 35 гадоў. Праўда, яны досыць рэдкія.

У залежнасці ад таго, якая частка галаўнога мозга атрафіруецца, праявы гэтага захворвання бываюць розныя. Калі паражаецца лобная доля, якая адказвае ў нас за паводзіны, то чалавек часцей за ўсё становіцца нахабным, агрэсіўным, расторможаным. Пры гэтым сціраюцца маральныя забароны, і чалавек пачынае жыць больш інстынктамі. Калі разбураецца скроневая доля, пакутуе слых, маўленне...

Таму клінічныя праявы могуць быць самыя разнастайныя. Агульнае толькі адно: чалавек становіцца не ў стане жыць адзін, яго хтосьці павінен дагледзець. Таму такіх людзей часта пазбаўляюць дзеяздольнасці і прызначаюць ім апекуноў.



## Колькасць тых, хто захварэў, расце

Цяпер у нашай краіне назіраецца дэмаграфічны правал: расце колькасць пажылых людзей, а колькасць маладых памяншаецца. Таму больш і псіхічных праблем, звязаных з узростам. Але, паколькі мала хто звяртаецца з гэтай нагоды да псіхіятра, афіцыйную статыстыку, якая ёсць у нас цяпер, можна смела памнажаць на тры ці нават на чатыры. Па звестках СААЗ, ад 5 да 7 % людзей сталага ўзросту пакутуюць на дэменцыю. У нас зараз атрымліваецца лічба дзесьці ў 2 %.

## Ці можа дапамагчы медыцына?

Звяртацца да медыкаў можна і трэба — да неўролага ці псіхіятра. Праўда, вылечыць такога чалавека медыцына не можа. Ёсць некаторыя прэпараты, якія могуць ледзь-ледзь запаволіць працэс: яны павялічваюць у галаўным мозгу колькасць шэрага рэчыва. Такія лекі маюцца і ў нашай краіне. Але яны могуць дапамагчы не ўсім. Што датычыцца прэпаратаў, якія ўзмацняюць кровазварот у мозгу, то яны могуць мець некаторы эфект хіба што на самых ранніх стадыях.

На сярэдняй стадыі развіцця захворвання медыкі могуць прапанаваць толькі сімптаматычнае лячэнне. Гэта значыць, напрыклад, можна зняць агрэсію, палепшыць сон пацыента — зрабіць так, каб сваякам было крыху лягчэй даглядаць такога чалавека. Бо часам у пацыента з дэменцыяй могуць быць галюцынацыі або, напрыклад, парушэнні памяці такога кшталту, што яны лічаць сябе маладымі і імкнуцца раніцай пайсці на работу... У гэтых выпадках медыкі могуць зняць паталагічныя сімптомы.

## Як даглядаць блізкага чалавека з дэменцыяй?

Калі мозг ужо не так добра функцыянуе, яму патрэбныя выразныя правілы і рэжым: напрыклад, класціся спаць у адзін і той жа час, у адным і тым жа пакоі. Насіць адну і тую ж вопратку (не ўводзіць адразу шмат новых рэчаў) — таму што мозг ужо дрэнна адаптуецца да новага.

Дарэчы, у людзей, якія жывуць у вёсцы, атрымліваецца даўжэй жыць з гэтай хваробай самастойна, таму што ў іх у жыцці ўсё звыкла, размерана і стэрэатыпна.

Але як толькі сваякі забіраюць іх да сябе, захворванне пачынае хутка прагрэсіраваць — у сувязі са зменай асяроддзя. Медыкі раяць у такіх выпадках забраць са старога дома па магчымасці больш знаёмых і звыклых чалавеку рэчаў — тады ён будзе адчуваць сябе спакайней.

Размаўляць з такім хворым трэба спакойна, мяккім голасам, але выразна, гледзячы на яго і выкарыстоўваючы простыя сказы з малой колькасцю слоў. Напрыклад: «Мама, надзень кашулю» — як з дзіцем. Можна выкарыстоўваць выразы, у якіх утрымліваюцца падказкі, напрыклад: «Твой сын, Іван». Тады мозг хворага чалавека адчувае меншую нагрузку.

І абавязкова трэба паклапаціцца аб бяспечным асяроддзі ў доме.

## Што можа прапанаваць дзяржава?

Але, як ні даглядаць такога хворага, рана ці позна (калі толькі чалавек не памрэ ад іншай хваробы) наступае апошняя стадыя, калі ён перастае пазнаваць сваякоў, не здольны кантраляваць сваю натуральную работу арганізма, шмат хто ў гэтай стадыі адмаўляецца ад ежы... Тут ужо неабходны догляд як за ляжачым хворым.

Гэта вельмі цяжка для сваякоў, вядома. Многія з іх разрываюцца паміж любоўю, жалем — і пачуццём гора, сораму, віны, гневу. Большасць адчуваюць велізарную бездапаможнасць і адзіноту, бо з сябрамі і калегамі такімі рэчамі звычайна не дзеляцца...

Многія даглядаюць хворых бацькоў да апошняга. Калі гэта немагчыма, пажылога чалавека можна пакласці на нейкі прамежак часу ў аддзяленне сястрынскага догляду. Туды бяруць толькі неагрэсіўных хворых і не з вострым псіхозам, бо там не могуць забяспечыць іх ахову і належны догляд. Гэта платная паслуга, але пенсія пакрывае яе кошт.

Таксама ў псіханеўралагічных бальніцах ёсць герыятрычныя аддзяленні, але іх пакуль няшмат. Прыняць пажылога чалавека яны могуць на абмежаваны час.

Акрамя таго, у краіне функцыянуюць псіханеўралагічныя дамы-інтэрнаты. Але, каб змясціць туды пажылога чалавека, спачатку трэба пазбавіць яго дзеяздольнасці, акрамя таго, у яго павінна быць група інваліднасці з-за гэтага захворвання. З гэтага года, калі ў пажылога чалавека маюцца сваякі працаздольнага ўзросту, па законе абавязаныя ўтрымліваць яго, змяшчэнне ж у такі дом-інтэрнат ажыццяўляецца на платнай аснове.

Апошнім часам у краіне таксама з'явіліся прыватныя дамы-інтэрнаты, дзе даглядаюць людзей з такой хваробай. Як варыянт, калі дазваляюць сродкі, можна наняць сядзелку. У ТЦСАН таксама маюцца сацыяльныя сядзелкі. Калі ж такога пажылога чалавека даглядае сваяк працаздольнага ўзросту, і пры гэтым ён больш нідзе не працуе, то чалавек можа атрымліваць дапамогу па доглядзе за непрацаздольнай асобай.

На жаль, варыянтаў, як дапамагчы сваякам людзей з дэменцыяй, не надта шмат. Між тым галоўнае зло гэтай хваробы — у тым, што яна губіць не толькі хворага, але і можа пацягнуць уніз усю сям'ю.

**Святлана БУСЬКО.**

### Раннія праявы дэменцыі

- **Узнікаюць цяжкасці пры падборы слоў у размове.**
- **Пагаршаецца кароткачасовая памяць.**
- **Узнікаюць сур'ёзныя праблемы пры прыняцці самастойных рашэнняў.**
- **Парушаецца ўспрыманне навакольнага асяроддзя, пазнаванне аб'ектаў.**
- **Чалавек лёгка губляецца, асабліва ў незвычайных абставінах.**
- **Адзначаецца дэзарыентацыя ў часе.**
- **Знікае ініцыятыва, адзначаецца безуважнасць і замкнутасць.**
- **Узнікаюць цяжкасці пры выкананні складанай хатняй работы (гатаванне ежы і іншага).**
- **Знікае цікавасць да ранейшых упадабаных заняткаў.**

### Тэст на дэменцыю

**МАЛЯВАННЕ ГАДЗІННІКА**

**Ёсць просты тэст для выяўлення кагнітыўных парушэнняў, якія можна прымяніць у хатніх умовах. Трэба папрасіць чалавека намаляваць гадзіннік: круг, у якім размясціць цыферблат і пазначыць стрэлкі, якія паказваюць, напрыклад, 20 хвілін на восьмую (можна назваць любы час). Калі пажылы сваяк намаляваў гадзіннік няправільна, яго трэба паказаць доктару.**

**ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «МИНСКИЙ ЭЛЕКТРОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД ИМЕНИ В. И. КОЗЛОВА» (продавец) извещает о проведении повторного 3 сентября 2019 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2**

| |
|---|
| **Номер лота – 1. Капитальное строение** с инвентарным номером 350/С-86422 (наименование: одноэтажное кирпичное здание; назначение: здание специализированное складов, баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), общей площадью 722,3 кв. м с двумя кирпичными пристройками, год постройки 1981, материал стен – кирпич. |
| **Дополнительно сообщаем:** ОАО «Минский электротехнический завод имени В. И. Козлова» заключен договор аренды № 69/10 от 20.10.2016 г. по 01.10.2021 г. с ЧП «Саленком». Предмет договора – часть капитального строения, которая представляет собой нежилые помещения в одноэтажном кирпичном здании, арендуемая площадь 106,6 кв. м |
| **Местонахождение:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Иногородняя 1-я, 25А |
| **Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000003001502 площадью 0,3761 га; участок для эксплуатации и обслуживания проезда общего пользования (доля в праве – 1/3): кадастровый номер 340100000003001501, площадью 0,2260 га |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС: 78 327,42** бел. руб. |
| **Задаток (5 %) с учетом НДС: 3 916,37** бел. руб. |

Объявление ранее опубликовано в газете «Звязда» от 25.07.2019 г.

**Продавец:** ОАО «МИНСКИЙ ЭЛЕКТРОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД ИМЕНИ В. И. КОЗЛОВА», 220037, г. Минск, ул. Уральская, 4, каб. 502.

Контактный телефон — 8-017-330-23-82.

**Шаг аукциона — 5 %. Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона (ООО «Деловая оценка»): р/с BY60BELB30121322650030226000** в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, **БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 30.08.2019 г. в 17.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее — ИП) Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь — доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или ИП Республики Беларусь — нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП — доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица — также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юр. лица в соответствии с учредительными документами или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати)** календарных дней с момента подписания протокола; если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **20 (двадцати)** календарных дней после подписания договора купли-продажи; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

# ПАКІДАЮЧЫ ЭЛІТУ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» раскажам пра фінальнае паражэнне беларускіх дзяўчат на маладзёжным чэмпіянаце Еўропы і іншыя актуальныя навіны выхадных.**

**1.** ***Беларускія баскетбалісткі занялі 15-е месца на маладзёжным чэмпіянаце Еўропы (U-20), які завяршыўся ў Чэхіі.*** У сваім заключным паядынку яны разграмілі аднагодак з Германіі, якія таксама пакідаюць элітны дывізіён, з лікам 65:45. Трэцім няўдачнікам стала каманда Партугаліі, якая саступіла баскетбалісткам Нідэрландаў у гульні за 13-е выніковае месца.

Пераможцам жаночага маладзёжнага Еўрабаскета стала зборная Італіі, якая абыграла ў паядынку за «золата» сапернікаў з Расіі.

**2.** ***Беларускія лёгкаатлеты занялі другое месца на камандным чэмпіянаце Еўропы ў першай лізе, які завяршыўся ў нарвежскім Санесе.*** Падчас турніру на першую прыступку п'едэстала падымаліся Віталь Парахонька (бег з бар'ерамі), Дар'я Барысевіч (бег на 1500 метраў), Алёна Дубіцкая (штурханне ядра), Таццяна Халадовіч (кіданне кап'я), Анастасія Міроньчык-Іванова (скачок у даўжыню), Карына Таранда (скачок у вышыню) і Ірына Жук (скачок з шастом). Другое месца занялі Эльвіра Герман (бег з бар'ерамі) і Крысціна Ціманоўская (бег на 200 метраў). У агульным заліку беларуская каманда набрала 281 бал і заняла другое месца. Пераможцам каманднага чэмпіянату Еўропы ў першай лізе стала зборная Партугаліі — 302 ачкі, якая і атрымала пуцёўку ў элітны дывізіён.

**3.** ***Вера Лапко прыпыніла выступленні з-за хранічнай траўмы калена.*** Тэнісістка ўжо не будзе гуляць у гэтым сезоне. Два тыдні таму беларуска замарозіла свой рэйтынг, цяпер па версіі Жаночай тэніснай асацыяцыі яна знаходзіцца на 135-м месцы.



Тым часам Вікторыя Азаранка і аўстралійка Эшлі Барці не здолелі прабіцца ў фінал парнага разраду тэніснага турніру катэгорыі «Прэм'ер» у канадскім Таронта. У паўфінальным матчы з чэшскім тандэмам Барбора Крэйчыкава/Кацярына Сінякова беларуска-аўстралійскі дуэт саступіў з лікам 6:3, 3:6, 4:10.

**4.** ***Завяршыліся матчы 17-га тура чэмпіянату краіны па футболе.*** БАТЭ разграміў мінскі «Энергетык-БДУ» — 4:1. У сталічным дэрбі футбалісты «Дынама» па ходзе сустрэчы на сваёй арэне двойчы саступалі «Мінску» — 0:1 і 1:2, але ў выніку атрымалі перамогу — 3:2. «Віцебск» у сябе дома прайграў «Гарадзеі» з лікам 0:2. Вынікі іншых сустрэч: «Дняпро» (Магілёў) — «Дынама» (Брэст) — 0:1, «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — «Славія» (Мазыр) — 1:1, «Гомель» — «Слуцк» — 3:4.

Становішча ў лідзіруючай групе: «Дынама» (Брэст) — 42 ачкі (17 матчаў), БАТЭ — 40 (16), «Шахцёр» — 31 (14), «Дынама» (Мінск) — 31 (16).

**5.** ***Хакеісты «Дынама-Мінск» прайгралі ташкенцкай камандзе «Хумо»*** з лікам 1:5 у паядынку за трэцяе месца на Кубку губернатара Ніжагародскай вобласці. Нагадаем, на групавой стадыі турніру «зубры» былі мацнейшыя за сапернікаў са сталіцы Узбекістана — 6:3. Пасля вяртання з Расіі мінскае «Дынама» ў ходзе падрыхтоўкі да сезона 17 і 18 жніўня згуляе ў вырашальнай стадыі Кубка Беларусі ў Оршы.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

## Аляксей ЖАРНАСЕК:
# «Адчуваю сябе камфортна і ў Беларусі, і ў ЗША, і ў Еўропе»

### Як спартсмен з Наваполацка стаў найлепшым вадналыжнікам у свеце

**Летнія месяцы для вадналыжнага спорту багатыя на буйныя міжнародныя турніры. У канцы ліпеня ў Іспаніі прайшоў чэмпіянат Еўропы. Зборная Беларусі ўжо звыкла для вадналыжнага свету аказалася сярод фаварытаў кантынента. Тытулаваны навапалачанін, шматразовы чэмпіён свету і Еўропы Аляксей Жарнасек заваяваў залаты медаль у фігурным катанні. Яшчэ адна беларуска Ганна Стральцова выйграла «серабро» ў скачках з трампліна. У суме мнагабор'я (фігурнае катанне, скачок з трампліна і слалам) Ганна заняла другое месца, трэцяе — у яшчэ адной беларускі Аляксандры Данішэўскай. У агульнакамандным заліку чэмпіянату зборная Беларусі размясцілася на другім месцы, апярэдзіць яе змаглі толькі французскія вадналыжнікі. Праз тыдзень у Малайзіі стартуе чэмпіянат свету, дзе на найвышэйшыя ўзнагароды зноў будуць прэтэндаваць беларускія спартсмены.**



Гарачая спаборніцкая пара стала добрай нагодай для інтэрв'ю з беларускім рэкардсменам свету Аляксеем Жарнасекам. Дарэчы, яго рэкорд з 2011 года так і не пабіты, у 2016-м навапалачанін быў прызнаны найлепшым вадналыжнікам свету. Сёння яму 39 гадоў, і ён працягвае трымацца ў лідарах. Адкуль у Наваполацку з'яўляюцца такія «зоркі» і на якім рахунку беларускія водныя лыжы, Аляксей расказаў у размове з карэспандэнтам «Звязды».

### «Я ТРАПІЎ У КОЛА АДНАДУМЦАЎ»

Застаць вядомага вадналыжніка ў Беларусі вельмі цяжка, пераезды ў яго жыцці займаюць каля шасці месяцаў у годзе, напрыклад, зараз ён знаходзіцца ў Малайзіі, а больш за ўсё часу пакуль што праводзіць у ЗША. Ва Фларыдзе найбольш камфортныя ўмовы для трэніровак, тлумачыць спартсмен.

— Працую там даўно, таму шмат каго ўжо ведаю, ёсць сувязі і людзі, якія мне там дапамагаюць.

Аляксей адзначае, што асноўная праблема пры пераездзе ў ЗША была звязана з моваю.

— Адна рэч, калі ты вучыш яе ў школе або ўніверсітэце, а іншая, калі табе трэба мець зносіны ў Амерыцы, дзе ў кожным штаце свой акцэнт. Я трапіў у кола аднадумцаў, у ЗША трэніруецца шмат вадналыжнікаў з Еўропы, Расіі, Аўстраліі, таму розніца паміж Беларуссю і ЗША не ўспрымалася цяжка. Магу сказаць, што адчуваю сябе камфортна і ў Беларусі, і ў ЗША, і ў Еўропе.

Прыязджаць у Наваполацк у Аляксея атрымліваецца раздва на год. Апошні візіт дома быў амаль год таму.

— Пасля чэмпіянату свету плануе зноў наведаць родных. Але ў Беларусі я бываю не ў адпачынку, трэніроўкі працягваюцца, бо ў Наваполацку надрэнная база, што дазваляе мне працягваць рыхтавацца да спаборніцтваў, а з дома, дарэчы, нават зручней ездзіць на еўрапейскія турніры.

### «АЛІГАТАРЫ НЕ ТАКІЯ АГРЭСІЎНЫЯ, ЯК КРАКАДЗІЛЫ»

У Аляксея ўжо больш за дзесяць званняў чэмпіёна Еўропы і свету, але ён адзначае, што кожны новы тытул усё роўна мае для яго высокі кошт.

— Вядома, выйграваць турнір сёмы раз ужо не так прыемна, як першы, але ўсё залежыць ад сітуацыі, таму што кожны год спа-

**Водныя лыжы бываюць адзіночныя і парныя. Да парных належаць фігурныя і скачковыя, да адзіночных — фігурная і слаламная моналыжа. Фігурныя лыжы кароткія, шырокія, трохі загнуты з двух канцоў. Традыцыйна спаборніцтвы па водных лыжах праводзяцца за катарам і за электрацягай. Фігурнае катанне, скачок з трампліна і слалам — дысцыпліны, у якіх выступаюць спартсмены.**

борніцтва — гэта нейкая пэўная мэта, драма. Ты не заўсёды гатовы на ўсе сто, увесь час існуюць нейкія нюансы, супраць якіх даводзіцца змагацца, і адпаведна ад гэтага перамога становіцца не менш важнай і прыемнай, — расказвае вадналыжнік.

Вылучыць самы важны тытул у сваёй кар'еры для Аляксея аказалася проста — гэта яго першае званне чэмпіёна свету ў вадналыжным спорце за катарам.

— Для мяне гэта была вельмі значная прыступка ў жыцці, таму што чэмпіянат свету за электрацягай я выйграў у даволі раннім узросце, мне было тады 18. Гэта было крута, шмат сіл пакладзена, але тытул за катарам я выйграў толькі праз 10 гадоў. Да таго ж гэты турнір больш прэстыжны і канкурэнцыя там значна большая, — адзначае спартсмен.

Наогул, самыя прэстыжныя спаборніцтвы ў вадналыжным спорце — чэмпіянат свету, ён праходзіць раз на два гады. Цяпер Аляксей рыхтуецца да чарговага такога старту ў Малайзіі, як заўсёды, ставіць перад сабой найвышэйшыя мэты. «Трэба перамагчы!» — кажа ён. Рэкорд у водных лыжах, пастаўлены беларусам у 2011 годзе, трымаецца дагэтуль, але ў плане ў навапалачаніна новыя здзяйсненні.

— Каб адбыўся новы рэкорд, павінны сысціся ўсе зоркі: добрая форма, выдатнае надвор'е, стадыён, суддзі. Прадказаць гэта немагчыма. Спроб было ўжо шмат, спадзяюся, у мяне яшчэ атрымаецца.

Дарэчы, сярод фактараў, ад якіх залежыць поспех выступлення вадналыжнікаў, — надвор'е і тып вадаёма, на якім выступаюць спартсмены.

— Ідэальныя ўмовы — гэта калі няма ветру, значыць, вада будзе гладкая. Пажадана, каб берагі былі пабудаваны пад ухілам, каб спартсменам не перашкаджалі адбойныя хвалі. Нюансаў шмат, аж да таго, што выступленне залежыць ад шчыльнасці вады, ад гэтага залежыць і хуткасць. Лепш за ўсё спаборнічаць на азёрах, якія выкапаны адмыслова пад наш від спорту, — як правіла, там атрымліваецца паказваць найлепшы вынік. Для паспяховага выступлення лепш прыязджаць на вадаём перад турнірам і рыхтавацца да старту ўжо непасрэдна на месцы, — дзеліцца Аляксей.

Дарэчы, вадналыжнікам часам даводзіцца сутыкацца з насельнікамі воднай стыхіі — напрыклад, у тым месцы, дзе цяпер трэніруецца Аляксей, водзяцца алігатары.

— Яны сапраўды там ёсць, але алігатары не такія агрэсіўныя, як кракадзілы ў Аўстраліі, якія, калі ты ў вадзе, адразу нападаюць. Да таго ж алігатары не дурныя, пад катар не лезуць. Часам сустракаюцца невялікія змеі, чарапахі, але гэта ўжо не выклікае ніякага здзіўлення.

### «БАЗЫ НЕ БЫЛО, ТОЛЬКІ НЕКАЛЬКІ ВАГОНЧЫКАЎ»

Цяпер Аляксею Жарнасеку 39 гадоў, але яго вынікі паказваюць, што гэта ніяк не ўплывае на канкурэнтаздольнасць беларуса, пра завяршэнне кар'еры ён яшчэ не думае.

— Я не адчуваю, што ўзрост уплывае на мае здольнасці. Гадоў дзесяць таму самым прадуктыўным часам у нашым відзе спорту было 30—35 гадоў, цяпер гэтая лічба ўсё больш павялічваецца, ёсць людзі, якім ужо за 40 і яны працягваюць выступаць. Мне здаецца, тэндэнцыя да павелічэння ўзросту назіраецца ва ўсіх відах спорту. Спартсмены прыкладаюць мноства намаганняў для аднаўлення, з'яўляецца шмат новых методык, таму ўзрост будзе працягваць павялічвацца.

А пачаў займацца воднымі лыжамі Аляксей Жарнасек у восем гадоў у Наваполацку, дзе нарадзіўся і вырас. Яго першай школай стаў знакаміты вадналыжны клуб імя М. Л. Генава. Спартсмен і сёння ўспамінае той перыяд з цёплымі пачуццямі.

— У той час, у 1988 годзе, умовы былі даволі суровыя, ба-

**Водныя лыжы ўпершыню з'явіліся ў 1922 годзе, калі амерыканец са штата Мінесота Ральф Самуэльсан, эксперыментуючы са звычайнымі зімовымі лыжамі, вырашыў выпрабаваць іх на вадзе. Дзве сасновыя шырокія дошкі ён абсталяваў крапяжом для ног, пасля чаго выпрабаваў лыжы на водах возера Пепін каля Лэйк-Сіці.**

**У СССР водныя лыжы пачалі развівацца з канца 50-х — пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя. У 1964 годзе шмат у чым па ініцыятыве першага касманаўта Юрыя Гагарына, які быў гарачым прыхільнікам водных лыж, была створана Федэрацыя вадналыжнага спорту, у 1965 годзе праведзены першы чэмпіянат СССР па водных лыжах.**

зы фактычна не было, толькі некалькі вагончыкаў, дзе можна было пераапрануцца, пакінуць свае рэчы, але паступова з дапамогай спонсараў — нам заўсёды дапамагаў «Палімір» — усё палепшылася. Цяпер там ужо ёсць новы катар, лыжы, інвентар. Але і раней усіх гэтых недахопаў не адчувалася — галоўнае, што заўсёды быў клопат з боку клуба і трэнераў, разуменне, што мы ўсе ідзём да агульнай мэты, — успамінае Аляксей. — З гадоў 14 я пачаў прагрэсаваць даволі хутка, быў фанатам сваёй справы і ніколі не думаў, што магу займацца чымсьці іншым. Я быў упэўнены, што выйграю чэмпіянат свету і ўвайду ў лік найлепшых вадналыжнікаў. У спорце заўсёды прыходзіць момант, калі робіцца вельмі цяжка, і толькі такая матывацыя, дакладнае разуменне таго, што ты хочаш рабіць, дапамагаюць справіцца.

### «У МЯНЕ БЫЛО ТРАЎМАВАНА, НАПЭЎНА, УСЁ»

Водныя лыжы — дастаткова траўманебяспечны від спорту, можна пашкодзіць калені, галёнкаступнёвыя суставы, спіну, сцёгны, плечы...

— У мяне было траўмавана, напэўна, усё, — прызнаецца Аляксей. — Сур'ёзнае пашкоджанне (вывіх сцягна) было пры падзенні з трампліна. Пасля гэтага ў скачках з трампліна я не выступаю ўжо 12 гадоў, займаюся толькі фігурным катаннем.

Беларусь сёння знаходзіцца ў пяцёрцы найлепшых краін у вадналыжным свеце. Звычайна канкурэнцыю нашым спартсменам складаюць прадстаўнікі ЗША, Канады, Францыі і Аўстраліі.

— У нас вельмі добрая рэпутацыя, ёсць спартсмены высокага класа, ёсць юніёры.

Аляксей адзначае, што водныя лыжы як від спорту ўжо каля дваццаці гадоў спрабуюць трапіць у праграму Алімпійскіх гульняў, але адбыцца гэтай падзеі ўвесь час штосьці перашкаджае.

— Апошнія пяць гадоў суб'ектыўныя, экстрэмальныя віды спорту, такія як сёрфінг, скейтбордынг, скалалазанне, трапляюць у лік алімпійскіх. У прынцыпе водныя лыжы знаходзяцца з імі ў адной лінейцы, таму шанц ёсць. Але для нашага віду патрэбна сур'ёзная інфраструктура, думаю, не ва ўсіх краінах яна ёсць. А наогул для мяне Алімпіяда — гэта больш падзея, у якой хацелася б прыняць удзел, паглядзець, як там усё арганізавана, чым спаборніцтва. Са спартыўнага пункту гледжання, мне здаецца, Гульні — гэта пераацэненая падзея. Вакол новых відаў спорту, напрыклад, з'яўляецца шмат карупцыі, лішніх людзей, грошай, скандалаў, гэта ўжо не чысты спорт.

# БАЛОТНЫ ФУТБОЛ І ЗАПЛЫЎ НА ТАНКУ



## На Аўгустоўскім канале прайшло брэндавае свята

**Яго адрадзілі некалькі гадоў таму. Такія забавы на шлюзе Дамброўка праводзіліся больш за 100 гадоў таму. Але свята заціхла пасля разбурэння канала. І вось калі беларускі бок поўнасцю адрадзіў сваю частку, свята мора таксама вырашылі аднавіць. І цяпер гэта самы цікавы і відовішчны брэнд Аўгустоўскага канала.**





### УСЁ НОВАЕ — ДАЎНО ЗАБЫТАЕ...

Традыцыйна свята мора праходзіць на шлюзе Дамброўка. Гэта самы «абжыты» з пяці шлюзаў на беларускай частцы канала — з прыгожым ландшафтам і турыстычнай інфраструктурай.

Калі паглыбіцца ў гісторыю, можна даведацца, што святочную падзею тут пачалі праводзіць больш за 100 гадоў таму. Канал быў поўнасцю суднаходны, і тут збіралася шмат людзей, якія на ім працавалі. А калі месца прыйшло ў заняпад падчас вайны, усё заціхла. І толькі пасля рэканструкцыі тут зноў зацяплілася жыццё.

Як адзначыў падчас адкрыцця свята **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ,** штогод тут бывае больш за 100 тысяч чалавек. Пастаянна ўдасканальваецца інфраструктура воднай жамчужыны. Канал аб'яўлены зонай бязвізавага знаходжання.

Тут курсіруе некалькі пасажырскіх параходаў, якія заўсёды запоўнены. Таксама на шлюзе Дамброўка можна ўзяць напракат веласіпед, байдарку, лодку, катамаран. Колькасць плавальных сродкаў з кожным годам павялічваецца. Па беразе пракладзены новы веламаршрут «Шляхам ятвягаў» працягласцю 24 кіламетры, які ўваходзіць у маршрут «Аўгуст Вела» і буйны міжнародны маршрут «Грын Вела». Дарэчы, такія водныя святы здаўна праводзяцца на польскай частцы канала ў горадзе Аўгустове.

### ГУЛЬЦЫ БРУДУ НЕ БАЯЦЦА

Свята мора не абыходзіцца без балотнага футбола. А сама ідэя гэтай гульні некалі была ініцыявана фінкамі. Звычайнага футбола не атрымалася, затое матч спадабаўся гледачам, якім было весела назіраць за тым, што адбывалася на гразевым полі. З той пары балотны футбол перанялі многія краіны.

З незабыўнымі эмоцыямі прайшоў балотны футбол на Аўгустоўскім канале. Для гульні тут існуе спецыяльная пляцоўка, супрацоўнікі МНС пастаянна падліваюць ваду на пясок. У некаторых месцах гразь даходзіць футбалістам да калена. У неардынарным спаборніцтве прынялі ўдзел 25 камандаў Гродзенскай вобласці, з якіх 17 мужчынскіх і 8 жаночых.

Як расказалі ўдзельнікі спартыўнага турніру, балотны футбол адрозніваецца ад традыцыйнага памерамі — і поле значна меншае, і працягласць гульні, у камандзе ўсяго пяць гульцоў і варатар. Ну і, вядома, умовамі гульні, якая вядзецца «на балоце».

Многія каманды ўдзельнічаюць не першы год. Яны складаюцца з прадстаўнікоў самых розных прафесій. Напрыклад, Кацярына Глуская з Ашмян працуе фельдчарам на хуткай дапамозе. Яе каманда паказала выдатную гульню і стала найлепшай сярод жаночых каманд.

А найлепшымі сярод мужчын сталі футбалісты Іўеўскага раёна. Дарэчы, свае каманды прадставілі ўсе раёны вобласці. Многія прыехалі са сваімі заўзятарамі. Напрыклад, мужчынскую каманду са Скідзеля падтрымлівалі амаль усе іх родныя. І гульцы не падвялі. Занялі адно з прызавых месцаў у вясёлым спаборніцтве. Некаторыя прызналіся, што гуляюць у балотны футбол з задавальненнем, бо гэта адрэналін, а гразевыя ванны нават карысныя для здароўя.

Праўда, летась было заяўлена, што ў гэтым годзе каманды згуляюць у футбол у фірменным працоўным адзенні: чыноўнікі — у гальштуках, повары — у калпаках, будаўнікі — у касках... Але, як аказалася, каманды зборныя, таму вылучыць для кожнай нейкую адну прафесію не атрымалася. Нягледзячы на гэта, усе каманды паказалі відовішчную гульню і сабралі вакол стадыёна сотні гледачоў. Таксама выклікаў цікавасць і пляжны валейбол, у якім прынялі ўдзел 22 каманды. Найлепшай стала каманда сельскагаспадарчага прадпрыемства «Ніва-2003» Гродзенскага раёна. У ліку прызёраў валейбалісты Мастоўскага і Лідскага раёнаў.



### ПЛЫЎ КАРАБЕЛЬ «З ЧАГО ПАПАЛА»...

І гэта сапраўды так. Вось ужо некалькі гадоў гэтае воднае шоу стала самым папулярным на канале. І кожны год на ваду спускаюць новыя і новыя плавальныя сродкі. Ніводзін «карабель» за гэты час не паўтарыўся. Праўда, ёсць варыяцыі. Напрыклад, летась быў беласнежны торт, а сёлета — яркі, каляровы, вышынёй тры метры пад назвай «Мучныя разваліны». Летась плыў бульдозер, а цяпер — танк Т-34... Яго прадставіла каманда Дзятлаўскага раёна. Удзельнікі абгрунтавалі свой выбар важнымі падзеямі — 75-годдзем вызвалення Беларусі і такім жа юбілеем Гродзенскай вобласці. У гонар гэтых дат і быў спушчаны на ваду легендарны танк, паведаміў камандзір Дзяніс Трафімчык. Танк рухаўся на вадзе пад залпы феерверка, і прыплыў да... перамогі. Ён атрымаў Гран-пры ў водным конкурсе.

Дарэчы, намінацый было нямала. І самая непатапляльная канструкцыя, і арыгінальная назва, і драйвавы заплыў, і найлепшае тэхнічнае рашэнне.

Здзівіла гледачоў ветэрынар з Воранава Тамара Казлоўская. Яна не першы год прымае ўдзел у заплыве. Напрыклад, летась з'явілася ў вобразе Бабы-ягі з катом Эрасам. А сёлета праплыла вярхом на яркім трохгаловым Змеі Гарынычы.

А вось прадстаўнікі паляўнічай гаспадаркі «Каменскае» Шчучынскага раёна ўдзельнічалі ўпершыню. Яны зрабілі сапраўдны паляўнічы прывал сярод дзікай прыроды. Плыт замацавалі на шасці металічных бочках, у выніку чаго на ім размясцілася пяць чалавек — паляўнічых і рыбаловаў.

Медыцынская тэма — адна з папулярных на заплывах. Вось і цяпер сваю інтэрпрэтацыю здаровага ладу жыцця прадэманстравалі супрацоўнікі Мастоўскай райбальніцы. Яны спусцілі на ваду судна пад назвай «Адрэналін». На думку ўдзельніка заплыву, менавіта адрэналін спрыяе настрою і пазітыву.

Перад тым як трапіць у фінал, усе ўдзельнікі сталі пераможцамі сваіх раённых спаборніцтваў. Сёлета іх набралася 11 — гэта крыху менш за 15 леташніх, але ўсе сродкі былі сапраўды цікавыя. Адчувалася, што ўсе ўдзельнікі грунтоўна падрыхтаваліся. Як зазначыла **намеснік начальніка ўпраўлення спорту і турызму Таццяна ЛІДЗЯЕВА,** выступілі найлепшыя з найлепшых. А такія святы даюць магчымасць прыцягнуць у гэты дзень большую колькасць турыстаў. Дарэчы, былі тут і госці з суседніх краін, і беларусы з іншых рэгіёнаў краіны. Многія спецыяльна прыехалі на канал, каб убачыць феерычнае свята.

Заплыў і балотны футбол — далёка не ўсё, чым бавіліся прысутныя. Працавалі шматлікія інтэрактыўныя пляцоўкі, многія засталіся ў захапленні ад пеннай вечарыны на паляне, дзе кожны мог акунуцца ў пенны басейн. Атракцыёнаў і конкурсаў хапала на розны густ. Працавалі «марскія» фотазоны. Налета брэндавы фестываль зноў вернецца, запэўнілі арганізатары свята. Без яго ўжо складана ўявіць Аўгустоўскі канал.





**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота БелТА.**

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

**Организатор торгов: ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: СООО «Никольстиль» (УНП 290308009) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +37529 130 85 30.

Повторные публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее – торги) будут проведены: **28 августа 2019 г.** с 09.00 до 17.00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов, местонахождение | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Шаг торгов / задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Административно-производственное здание (инв. № 100/С-72206), г. Брест, ул. Гоздецкого, 10, в составе с движимым имуществом (подробнее на beltorgi.by) | 1 359 092,80 | 67 954,64 |
| 2 | Грузовой фургон MERCEDES-BENZ SPRINTER 313 CDI, 2001 г. в., кузов № WDB9036621R296461, г. Брест, ул. Гоздецкого, 10 | 5 310,00 | 265,50 |

**Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 18.**

**Для участия в торгах необходимо в срок по 27.08.2019 г. до 17.00** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 01.06.2019 г., 09.07.2019 г.

---

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»** (организатор аукциона) **по поручению ОАО «Гомельоблстрой»** (продавец) **в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 28 августа 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 60 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

